КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №46 (174)
◂ 11 СНЕЖНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**ВОЙЦЭХ БАРОДЗІЧ-СМАЛІНЬСКІ**

Стар. 5

**СУЧАСНАЕ БЕЛАРУСКАЕ СЯРЭДНЯВЕЧЧА**
Дзяржава — наша ўсё. Такая афіцыйная версія. На жаль, з ёй даводзіцца пагадзіцца. Чаму «на жаль»?
Стар. 4

**УКРАІНСКІЯ ВЫБАРЫ: ПОГЛЯД З РАДЗІМЫ ЦІМАШЭНКА**
Зміцер Дудач, днепрапятроўскі гісторык і журналіст, разважае пра электаральныя пазіцыі прэм'ера
Стар. 13

**БЕРЛІНСКІ МУР У ПЫТАННЯХ І АДКАЗАХ**
Стар. 14–15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА**

Матэрыялы круглалага стала беларускіх і польскіх гісторыкаў

▸ **АД РЭДАКТАРА**

# МЕДЫЙНЫ СУСВЕТ І МЕДЫЙНАЯ БЕЛАРУСЬ

*Аляксей КАРОЛЬ*

**Сум, сорам і гонар — вось тыя парадаксальныя пачуцці, якія я нечакана для сябе вынес ад удзелу ў 62-м Сусветным кангрэсе газет і 16-м Сусветным форуме рэдактараў, што праходзілі на пачатку снежня ў індыйскім горадзе Хайдарабад. Сум, сорам і гонар за стан і якасць беларускіх СМІ, беларускай журналістыкі, сваёй прафесіі ў нашай краіне.**



Індыйскі танец. Канцэрт на цырымоніі адкрыцця форуму

Тое, што, здавалася, было вядома, аб чым здагадваліся, а што нават і не ўяўлялі, маштаб магчымага і страчанага — усе гэта выявілася з незвычайнай яркасцю на фоне сусветнай медыяпрасторы, аб'ёмную выяву якой і акрэсліў форум.

Гэта прастора з трохмільярдным (у доларах) гадавым абаротам, нягледзячы на крызіс, на змяншэнне прыбыткаў ад рэкламы на 13 працэнтаў у першай палове 2009 года. Прастора са шматмільярднай аўдыторыяй. Нават у крызіс тыражы газет, што ўваходзяць у Сусветную асацыяцыю газет (WAN-IFRA) у Еўропе, выраслі на 1,5 працэнта. У Японіі прадаецца 612 газет на 1000 чалавек.

Сімвалічна, што форум адбыўся ў Індыі — другім па памеры медыйным рынку ў свеце (пасля Кітая). У Хайдарабадзе — горадзе высокіх тэхналогій, шырокапалоснага інтэрнэту і адначасова горадзе, дзе выдаецца больш за 280 газет, лідэры з якіх маюць тыраж ад мільёна асобнікаў. У прыватнасці, «The Times of India» за 20 гадоў прайшла шлях ад 20 тысяч тыражу да 6 мільёнаў. У суадносінах да агульнай колькасці насельніцтва гэтыя лічбы можна супаставіць з 250 тысячамі «Народнай газеты» пачатку 1990-х. Як знак цаны рэпрэсіўна абарванай тэндэнцыі развіцця свабоднай беларускай прэсы.

Беларусь — па-за межамі гэтай сусветнай медыяпрасторы. Таму і сум — ад страчаных магчымасцей. І сорам, што маглі, але не здолелі стрымаць адкат у новую несвабоду. А гонар — за тое, што ўтрымалі хаця і абмежаваную выспу незалежных СМІ. Дзяржаўныя СМІ нават не ўзгадваліся на форуме, бо яны, як было мімаходзь адзначана, — не сродак інфармацыі, а інструмент прапаганды і знаходзяцца ў зусім іншай сістэме каардынатаў, варожай вольнаму слову.

Збор каля 1000 рэдактараў, выдаўцоў і менеджэраў з 87 краін свету ў адным месцы, на адным форуме — з'ява, ужо хаця б самім сваім фактам, з шэрагу выбітных. Але самае выбітнае — змест, інтэлектуальнае багацце сустрэчы. Новыя ідэі, новы досвед, новыя мадэлі.

Быў прадстаўлены даклад пра сусветныя тэндэнцыі развіцця газетнай індустрыі. Абмяркоўваліся пытанні будучыні журналістыкі, зместу і формы выданняў, спалучэння друкаваных і мультымедыйных платформ, а таксама бізнес-мадэлі для далейшага развіцця СМІ.

Праграма форума была сканцэнтравана на дзвюх асноўных тэмах: свабода слова і развіццё СМІ ва ўмовах фінансавага крызісу. Паказальна, што форум пачаўся з працы сесій, і менавіта па праблемах свабоды СМІ. І толькі на другі дзень адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця, на якой выступіла з прывітальным словам прэзідэнт Індыі Працібха Паціл.

Форум выявіў два ўзроўні пагрозаў свабодзе слова: з боку дзяржаўнай улады — у несвабодных, недэмакратычных краінах і з боку рэкламадаўцаў — у дэмакратычных.

І аднолькавыя метады ціску і рэпрэсій: абвінавачванні ў здрадзе, у дэстабілізацыі сітуацыі, у распальванні рознага кшталту варожасці, пагрозы па тэлефоне, арышты і выкраданні прагрэсіўных журналістаў і іх сямейнікаў, падатковы ціск, байкот рэкламы, абмежаванні распаўсюду, закрыццё газет. Дзякуй богу, у Беларусі яшчэ не ўзрываюць рэдакцыі і машыны журналістаў, пра што распавёў Хасэ Рубен Замора, рэдактар з Гватэмалы, на жыццё якога было сем замахаў. «Тэрарызм, — сказаў ён, — гэта калі ты баішся заснуць, каб не быць забітым. Самае страшнае гэта — дзяржаўны тэрарызм».

Традыцыйна на цырымоніі адкрыцця форума была ўручана ўзнагарода «Залатая асадка свабоды» ў знак салідарнасці з журналістамі і рэдактарамі, якія пераследуюцца за свае перакананні і выкананне прафесійнага абавязку. Лаўрэатам 2009 года стаў рэдактар пакістанскіх газет «Friday Times» і «Daily Times» Найям Сетхі. У 2003 годзе «Залатую асадку свабоды» атрымала Беларуская асацыяцыя журналістаў.

Якасная журналістыка ў свабодных і несвабодных краінах мае розны кошт. З вуснаў тытуляваных мэтраў беларускіх праўладных СМІ не раз даводзілася чуць нараканні на прафесійную слабасць беларускай журналістыкі, з падкрэсленай прэтэнзіяй на аб'ектыўнасць: як дзяржаўных, так і незалежных. Не трэба, спадары. Свае грахі пакіньце сабе. Беларуская дзяржаўныя СМІ — непасрэдныя нашчадкі савецкіх, якія ў параўнанні са свабоднай прэсай заўсёды былі мёртвымі СМІ, прапагандысцкімі муміямі, што выдавалі сябе за жывых. Перабудовачнае свята непаслушэнства надало ім жыццё. Адкат да таталітарызму пасля 1994 года зноў вярнуў іх у стан мумій.

Планку якаснай журналістыкі трымаюць якраз тыя паўтара-два дзесятка незалежных газет, што здолелі ацалець пад ударамі аўтарытарнага рэжыму, і тыя новыя электронныя СМІ, на якія гэты рэжым яшчэ не паспеў накінуць прыгатаваную ўдаўку. Адпаведнасць іх прадукту стандартам якаснай журналістыкі нечакана выявіліся ў рэчышчы тых прапаноў, што прагучалі на форуме ў якасці рэцэптаў выжывання і падвышэння тыражу газет.

Гэта — кантэнт, каштоўнасці, змест з арыентацыяй на адукаваную, інтэлектуальную аўдыторыю. Сур'ёзная, аднак не занудная аналітыка. Глыбока распрацаваная і ярка расказаная гісторыя. Як адзначыў партугальскі журналіст, прэзентуючы сваю новую газету, што за паўгода набыла вядомасць і тыраж, атрымала тытул найлепшай еўрапейскай газеты: прывесці чытача туды, дзе ён ніколі не бываў. «Людзі шукаюць сэнсу, а не толькі навін», — адзначыў французскі журналіст. «Наша навацыя, — распавёў журналіст з Бразіліі, — фармат таблоіда, але сур'ёзны змест».

Гэта — адмова ад вузкай прафесійнай спецыялізацыі, пошук і падрыхтоўка журналістаў, якія здольны пісаць у розных жанрах, не паўтараць іншых. Ну і, зразумела, гэта — сучасны дызайн, дакладныя і прывабныя ілюстрацыі — фота, малюнак, графіка.

І калі замежныя калегі распавядалі пра адпаведныя змены канцэпцый старых выданняў і паспяховыя новыя, я з задавальненнем пазнаваў у іх рысы беларускіх незалежных СМІ. Мы ўтрымалі змест з іншых, чым у свабодных краінах, прычын. Іх сённяшнія пагрозы — гэта выдаткі свабоды, свабоднага медыярынку. Для нас гэта будучыя пагрозы. Ведаючы іх — лягчэй абмінуць, утрымаўшыся на платформе зместу, каштоўнасцей.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### НАВАПОЛАЦК. ПРЭЗЕНТАЦЫЯ САЙТА

Суполка «Рубон» гарадской арганізацыі ТБМ арганізавала сустрэчу з рэдактарам сайта studfarmat.org, прадстаўніком БМА Алесем Лукашэвічам. На сустрэчы быў прэзентаваны сайт, адбылася дыскусія па тэме моладзевых інтэрнэт-ініцыятываў. Алесь распавёў пра праекты «Не заганяйся», «UnReal Student life», прэзентаваў дыск «Дзень студэнта», які кожны прысутны атрымаў у падарунак.

### ГЛЫБОКАЕ. ПРЫЙШЛА «РАДАСЦЬ»

У сеціве з'явілася магчымасць праслухаць песні гурта «Радасць» on-line. Гурт быў створаны ў 2008 годзе і ўжо запісаў дыск «Крылы сэрцам дай». Усё песні носяць рэлігійны характар, з'яўляюцца выключна аўтарскімі і запісаны пры выкарыстанні акустычных інструментаў. Творы можна праслухаць па спасылцы: http://catholic-songs.ru/index.php. У хуткім часе дададуцца словы і акорды, а таксама з'явіцца магчымасць спампоўваць кампазіцыі.

### ГАНЦАВІЧЫ. КУЛЬТУРУ Ў ПРАВІНЦЫЮ

У гарадскім Доме культуры Брэсцкі тэатра драмы і музыкі сыграў драму «Вечар». Сімвалічна, што выступленне абласнога тэатра на ганцавіцкай сцэне адбылася ў дзень 70-годдзя Брэсцкай вобласці. Прапанаваная ганцаўчанам драма ў дзвюх дзеях «Вечар» пастаўлена па п'есе Аляксея Дударава і належыць да ліку класічных твораў сучаснай беларускай драматургіі — толькі ў 1995 годзе яе ўключылі ў свой рэпертуар 36 тэатраў. Галоўныя ролі ў спектаклі выконваюць артысты тэатра Мікалай Маршын (Васіль), Тамара Ляўчук (Ганна), Міхаіл Мятліцкі (Гастрыт).

### ПІНСК. ЧАРНОБЫЛЬ ДАЕ НАПАМІН

Па ініцыятыве філіяла Беларускага аддзялення Расійска-беларускага інфармацыйнага цэнтра па праблемах наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у Пінскім райвыканкаме адбылася нарада спецыялістаў раёна, занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, лясгаса, старшыні сямі сельсаветаў, тэрыторыі якіх найбольш забруджаныя. Абмяркоўвалася пытанне іх рэабілітацыі і развіцця. Больш чым праз дваццаць гадоў ад пачатку катастрофы тут нарэшце распачнецца даследаванне радыеактыўнага забруджвання тэрыторыі.

АКЦЫЯ

# ЗМАГАЦЦА ЗА ЖЫВЁЛ ЗАБАРАНІЛІ

**Мінгарвыканкам не дазволіў правядзенне акцыі, прымеркаванай да Міжнароднага дня правоў жывёл, які адзначаецца 10 снежня. Заяўнікам выступала грамадскае аб'яднанне абароны жывёл «Эгіда».**

Заяўка на правядзенне мерапрыемства па прыцягненні ўвагі да праблем жывёл была пададзена 9 лістапада. Акцыю планавалі правесці 12 снежня ў чатырох месцах Мінска: у парку імя Горкага, скверы імя Янкі Купалы (па 50 чалавек), на скрыжаванні вуліц Сурганава і Якуба Коласа, на скрыжаванні вуліц Раманаўская Слабада і Няміга (па 20 чалавек).

Абаронцы жывёл мелі намер выйсці на сталічныя вуліцы з лозунгамі і плакатамі ў падтрымку бяздомных жывёл. Штогод у Беларусі адлоўліваюць і знішчаюць прыкладна 70 тысяч безнаглядных сабак і катоў, у тым ліку ад 3 да 5 тысяч у Мінску. Падчас акцыі планавалася сабраць подпісы ў падтрымку арганізацыі ў сталіцы першага прытулку для бяздомных жывёл і раздаць улёткі супраць нашэння футра, спартыўнага палявання, у падтрымку вегетарыянства.

2 снежня Мінгарвыканкам не санкцыянаваў правядзенне акцыі на падставе таго, што абаронцы жывёл няправільна запоўнілі заяву. Перад гэтым старшыні ГААЖ «Эгіда» Наталлі Бяляновай патэлефанаваў супрацоўнік гарвыканкама і прапанаваў перанесці акцыю ў парк імя Дружбы народаў. А пасля адмовы праводзіць мерапрыемства на «аддаленым ад цэнтра пустэльным месцы», прыйшоў адказ Мінгарвыканкама, у якім акцыю забаранілі з-за няправільна запоўненай заявы.

Паводле меркавання старшыні ГААЖ «Эгіда», на самай справе акцыю забаранілі з-за таго, што форма яе правядзення нагадала гарадскім уладам мітынг пратэсту.

Дагэтуль, з 2007 года, гэта грамадскае аб'яднанне паспяхова атрымлівала дазволы на правядзенне акцый у падтрымку жывёл, на якіх выступалі артысты, раздавалі бяздомных жывёл. Заявы на ўсе акцыі запаўняліся паводле адной і той жа формы.

Бяланава мае намер апратэставаць адмову гарвыканкама ў судзе.

**Паводле БелаПАН**

ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

# У ЧАКАННІ БЕСПРАЦОЎЯ

Сяргей СЕМЯНОВІЧ

**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Сямён Шапіра паведаміў, што ў бліжэйшы час плануецца скараціць агульную колькасць льнозаводаў у Беларусі да 22.**

Калі далейшы лёс Шклоўскага льнозавода вызначаны ў лепшы бок — прадпрыемства атрымае новае замежнае абсталяванне і працягне сваю працу, то вялікае пытанне, ці застанецца далей льнозавод у Круглым. Адзінае прамысловае прадпрыемства Круглянскага раёна знаходзіцца ў вельмі цяжкім фінансавым стане.

Зараз на прадпрыемстве няма пастаяннага кіраўніка, змянілася ўжо некалькі «выконваючых абавязкі дырэктара», а пра месцазнаходжанне мінулага дырэктара завода не ведае дакладна ніхто з супрацоўнікаў таварыства. Летам работнікаў прадпрыемства адправілі ў працоўныя адпачынкі, грошы за адпачынак супрацоўнікі таварыства з вялікімі цяжкасцямі і пасля шматлікіх скаргаў у розныя інстанцыі змаглі атрымаць праз значны час. Зараз заробак на заводзе выплачваецца за кошт крэдытаў банка і дапамогі дзяржавы.

Раней была надзея, што грошы ў развіццё прадпрыемства ўкладзе прыватны інвестар. З восені 2008 года паміж прадстаўнікамі дзяржавы і групай інвестараў, якую прадстаўляе вядомы прадпрымальнік Сяргей Левін, вяліся перамовы пра тое, што бізнесмены набудуць шэсць з сямі льнозаводаў Магілёўскай вобласці — у Хоцімску, Мсціславе, Шклове, Горках, Круглым і Кіраўску. Інвестыцыі ў кожны з льнозаводаў павінны былі скласці 8–10 мільёнаў долараў. Аднак у верасні стала вядома, што Сяргей Левін афіцыйна паведаміў пра адмову ад рэалізацыі праекта (бакі не здолелі дамовіцца пра кошт прадпрыемстваў).

Зараз супрацоўнікі ААТ «Круглянскі льнозавод», большая частка якіх працуе на заводзе шмат гадоў, знаходзяцца ў чаканні, што будзе з прадпрыемствам далей.

УЗНАГАРОДЫ

# «ПРАВААБАРОНЧЫ АЛЬЯНС» УРУЧЫЎ ПРЭМІІ

Генадзь КЕСНЕР

**9 снежня ў Мінску «Праваабарончы альянс», што зарэгістраваны ў Вільні, уручыў штогадовыя прэміі ў намінацыях «Журналіст года», «Праваабаронца года» і «Адвакат года». Арганізацыя ўжо другі год запар ладзіць такую цырымонію ўганаравання напярэдадні ўгодкаў прыняцця Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека.**

Лепшым адвакатам па версіі «Праваабарончага альянсу» сёлета стаў Павел Сапелка. Прэмію яму ўручыла мінулагодні ўладальнік узнагароды ў гэтай намінацыі адвакат Тамара Сідарэнка.

«Павел Сапелка браў удзел у шэрагу адміністратыўных працэсаў, пачынаючы ад абароны правоў Аляксандра Мілінкевіча, Анатоля Лябедзькі, іншых вядомых людзей. Ён абараняў фігурантаў крымінальнага «Працэсу чатырнаццаці», а зараз завяршае азнаямленне з матэрыяламі крымінальнай справы па абвінавачванню Мікалая Аўтуховіча, — нагадала Тамара Сідарэнка. — Таму добра відаць, што гэты адвакат заняты сур'ёзнай працай. Прафесія адваката, як і праца журналіста, з'яўляецца публічнай, мы са сваіго боку такса ма імкнёмся забяспечыць правы чалавека, абараніць гэтыя правы, дапамагчы чалавеку, калі супраць яго распачынаюцца нейкія справы, нават ва ўмовах, калі не заўсёды спрацоўвае закон. Я рада павіншаваць майго калегу з гэтай высокай узнагародай».

Прэмію сёлетняму лаўрэату ў намінацыі «Журналіст года» ўручыў мінулагодні ўладальнік гэтай узнагароды, карэспандэнт незалежнага тыднёвіка «Наша ніва» Сямён Печанко.

«Сама па сабе прафесія журналіста — гэта больш чым проста праца, а праца журналіста, які займаецца палітычнай, праваабарончай сферай, акрамя побытавых нязручнасцяў, як то праца ў выходныя, праца ў ночы, нясе з сабою яшчэ і рызыкі жыццю, здароўю, — сказаў Сямён Печанко. — Працуючы ў гэтай сферы, журналіст мусіць ведаць, што праз яго працу могуць пацярпець родныя і блізкія… Для мяне як лаўрэата мінулагодняй прэміі вялікі гонар узнагародзіць гэтага чалавека, бо Алег Груздзіловіч — гэта ў пэўным сэнсе мой настаўнік, як і многія іншыя мае старэйшыя калегі, бо калі я яшчэ толькі быў чытачом газет «Свабода», «Наша ніва», слухаў «Радыё Свабода», гэтая людзі ўжо працавалі, выходзілі на вуліцы, рызыкавалі».

Лаўрэатам прэміі «Праваабаронца года» ў намінацыі «Праваабаронца года» стаў вядомы ў Беларусі змагар супраць смяротнага пакарання Раман Кісляк. Усе лаўрэаты атрымалі кветкі і памятныя падарункі.

ВІНШАВАННЕ

# АНАТОЛЮ БЕЛАМУ — 70 ГАДОЎ!

**У гэтага чалавека, якога без сумневу можна назваць адным з пачынальнікаў сучаснага беларускага адраджэння, сёлета трайны юбілей: 70 гадоў са дня народзінаў, 25-я ўгодкі заснавання ім з паплечнікамі клуба «Спадчына» і 10-годдзе з дня адкрыцця прыватнага музея ў Старых Дарогах.**

Анатоль Яўхімавіч Белы нарадзіўся 10 снежня 1939 года ў горадзе Старыя Дарогі Мінскай вобласці. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1967). З 1995 года выкладаў у БДУ. Старшыня грамадска-асветніцкага клуба «Спадчына» (1984), сябар Саюза мастакоў Беларусі (1995) і Саюза беларускіх пісьменнікаў (1999).

Ён сабраў вялікую калекцыю твораў жывапісу, графікі, медальернага і дэкаратыўнага мастацтва (каля 3000 адзінак). Арганізаваў процьму тэматычных выстаў. На аснове сваёй калекцыі ва ўласнай



сядзібе ў Старых Дарогах адкрыў прыватны музей выяўленчага мастацтва.

Ён — удзельнік Устаноўчых з'ездаў Беларускага народнага фронту, Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Сумесна з сябрамі клуба «Спадчына» ў 1985 годзе выступіў ініцыятарам звароту ў ЦК КПБ, Савет Міністраў БССР і Вярхоўны Савет БССР аб ушанаванні 125-х угодкаў студзеньскага паўстання 1863 года пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Адзін з тых прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, якія падпісалі ліст у ЦК КПСС аб стане беларускай мовы і культуры ў Беларусі. Актыўны заснавальнік таварыства «Бацькаўшчына». Адзін з заснавальнікаў і Ганаровы сябар рэдкалегіі беларуска-амерыканскага часопіса «Полацак» (1991, Клiўленд, ЗША).

Анатоль Яўфімавіч узначальвае Камітэт Ушанавання, што ўганараваў ордэнамі, кубкамі «Спадчыны», медалямі звыш 250 дзеячаў навукі і культуры Беларусі.

За ўдзел у мітынгах быў неадназова арыштаваны. За свае палітычныя перакананні і дзеянні тройчы быў звольнены з працы.

Каб пералічыць усё тое, што ўжо зрабіў гэты няўёмны і спорый да працы чалавек, не хопіць цэлай газетнай старонкі.

Рэдакцыя газеты «Новы час» шчыра віншуе юбіляра і зычыць яму яшчэ шмат гадоў плённай працы на ніве беларускага адраджэння!

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# СВІННЯ ДЛЯ МАРТЫНАВА

Сяргей САЛАЎЁЎ


Photo.ByMedia.Net

**Як зазвычай у Беларусі, левая рука ўлады не ведае, што робіць правая. Правая рука — Сяргей Мартынаў — выправіўся ў Брусель на сустрэчу міністраў замежных спраў ЕС і краін-удзельніц праграмы «Усходняе партнёрства». А правая тым часам падклала яму такую свінню, што «свіны грып» перад гэтым — нішто.**

Вялікі розгалас на мінулым тыдні атрымалі два выпадкі выкрадання беларускіх апазіцыянераў. 5 снежня Дашкевіч павінен быў удзельнічаць у падпісанні пагаднення пра стварэнне моладзевай кааліцыі «Новае пакаленне». Аднак у 11.00, калі палітык выйшаў са сваёй кватэры на Партызанскім праспекце, на яго напалі пяцёра невядомых. Дашкевіча, які нават не паспеў зачыніць дзверы ў кватэру, вывелі з пад'езда, надзелі яму на галаву дзве шапкі, якія закрылі вочы, пасадзілі ў мікрааўтобус. Пяць з паловай гадзін яго вазілі, пасля чаго выкінулі ў лесе недалёка ад вёскі Антонаўка Лагойскага раёна Мінскай вобласці.

А ўвечары 6 снежня невядомыя скралі каардынатара грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Яўгена Афнагеля. Па тым жа сцэнары — запіхнулі ў белую легкавушку, галаву нахілілі, каб не глядзеў у вакно, і выкінулі каля вёскі Жукаў Луг.

Гэта інфармацыя не засталася без увагі Еўропы. Старшыня Еўрапейскага парламента Ежы Бузэк папярэдзіў улады Беларусі, што такія выпадкі не павінны мець месца: «Еўрапейскі парламент лічыць, што трэба працягваць дыялог з Беларуссю пры пэўных умовах: гэта павінна спалучацца з прагрэсам у сферы дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства закона. Падобныя выпадкі, такія, як выкраданні і запалохванні, ставяць пад пытанне цяперашні падыход краінаў — сябраў Еўрасаюза да Беларусі».

Яшчэ большую свінню падклала Мартынаву кіраўніцтва юрыдычнага факультэта БДУ, якое адлічыла прэс-сакратара міжнароднай моладзевай арганізацыі «Малады фронт» (Чэхія) Таццяну Шапуцьку за ўдзел у Форуме грамадзянскай супольнасці праграмы «Усходняе партнёрства» ў Брусэлі 16–17 лістапада без дазволу дэканата юрыдычнага факультэта. Пра магчымасць яе адлічэння стала вядома яшчэ 16 лістапада, калі яна знаходзілася ў Брусэлі. Пра гэта былі праінфармаваныя еўрапейскія чыноўнікі. І ўсё ж Шапуцьку адлічылі. Што не магло не адбіцца на стаўленні да Мартынава ў тым жа Брусэлі.

Не дзіва, што Мартынаў пачуваў сябе нялёмка і вымушаны быў апраўдацца. Маўляў, «выключае не ўрад, а ВНУ». Ён падкрэсліў, што прычынай адлічэння стала «колькасць пропускаў». У адказ міністр замежных спраў Швецыі Карл Більдт адзначыў, што «з кіраўніцтвам ВНУ звязаліся прадстаўнікі праваахоўных органаў». «Яны, вядома, маглі цікавіцца яе пропускамі, але звычайна гэта не ўваходзіць у іх абавязкі», — заявіў шведскі міністр.

Карацей, Мартынаву засталося толькі прамовіць загадзя падрыхтаваны спіч пра тое, што «рэалізацыя праектаў у межах «Усходняга партнёрства» патрабуе сур'ёзнага паскарэння», і што «Беларусь, Літва і Украіна прэзентавалі прыблізна 20 сумесных рэгіянальных праектаў, у прыватнасці ў галіне энергетыкі, энергетычнай бяспекі, транспарту, транзіту, кіравання межамі, агульнай культурнай і гістарычнай спадчыны».

А яшчэ маленькую свінку Мартынаву падклала сваё ж ведамства. Міністэрства замежных спраў Беларусі зноў не дазволіла польскаму тэлеканалу «Белсат» адкрыць у краіне карпункт.

8 снежня прадстаўнік канала Міхаіл Янчук наведаў МЗС, дзе яму былі дадзены адказ на заяўку «Белсата» аб адкрыцці карпункта. У дакуменце за подпісам намесніка міністра Валерыя Варанецкага адзначаецца, што, паводле наяўнай у МЗС інфармацыі, на працягу 2009 года беларускія органы пракуратуры вынеслі папярэджанні шэрагу грамадзян краіны за працу ад імя тэлеканала «Белсат» без акрэдытацыі пры МЗС.

Тым самым, гаворыцца ў адказе, былі парушаны патрабаванні закона аб СМІ і палажэнні аб акрэдытацыі карэспандэнтаў замежных СМІ ў Беларусі. З гэтай прычыны «Белсату» адмоўлена ў адкрыцці карпункта.

Дзіўная сітуацыя: спачатку папярэджваць журналістаў за «нелегальную» працу на замежны тэлеканал, а калі журналісты спрабуюць легалізавацца — адмаўляюць ім у гэтым на той падставе, што яны працуюць нелегальна! Дарэчы, і чаму толькі Янчуку, які падаваў дакументы на адкрыццё карпункта ў Беларусі, адразу ж у МЗС не ўручылі папярэджанне за тое, што ён працуе на замежны тэлеканал і ад яго імя падае дакументы на адкрыццё карпункта? А што? Падаў дакументы — значыць, працуеш на замежнае СМІ, адразу ж атрымліваеш і папярэджанне, і адмову ў легалізацыі працы. І ніякай бюракратыі!

Толькі бланкі трэба загадзя падрыхтаваць і ўпісваць туды імя і прозвішча таго, хто падае дакументы.

Шчыра кажучы, я б не змог патлумачыць замежнікам такую практыку. Яны ж гэтага папросту не разумеюць. У іх мазгі не так працуюць, як у нашых чыноўнікаў.

А Мартынаў пры гэтым яшчэ спадзяецца, што «праблема дыскрымінацыі беларусаў з боку Еўрасаюза ў візавых пытаннях будзе вырашана найбліжэйшым часам», як перадае прэс-служба МЗС! Вы спачатку спыніце практыку дыскрэдытацыі замежных СМІ ў Беларусі, а потым ужо дбайце пра тое, каб замежнікі спынілі дыскрымінацыю беларусаў!

І яшчэ адзін сімптом. На тыдні не атрымалася свята. 8 снежня 1999 года ў Маскве прэзідэнтамі Беларусі і Расіі Аляксандрам Лукашэнкам і Барысам Ельцыным была падпісана Дамова аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. З таго часу мінула 10 гадоў. І гэты юбілей застаўся незаўважаным. Не было ніякіх святкаванняў на дзяржаўным узроўні. Толькі прэзідэнты абмяняліся пратакольнымі вітальнымі словамі. І ўсё.

І не дзіва, бо ўжо на трэці год Пуцін заявіў беларускаму кіраўніцтву: «Мухі асобна, катлеты — асобна». Лукашэнка паказаў дулю Пуціну ў адказ на прапанову ўвесці адзіную валюту — расійскі рубель. Пуцін прапанаваў Беларусі ўвайсці ў Расію шасцю абласцямі — у адказ яшчэ большая дуля. Потым былі дзве «газавыя вайны», «малочная вайна», «камбайнавая вайна», «цукровая вайна» ды шмат іншых войнаў.

Адзінае, за што мы павінны быць удзячнымі гэтай Саюзнай дзяржаве, што Аляксандр Рыгоравіч нарэшце зразумеў кошт незалежнасці Беларусі: не толькі матэрыяльны, але і маральны. І зараз, пэўна, ён стаў адданым «незалежнікам», для якога суверэнітэт краіны, прыкметы яе дзяржаўнасці — герб, гімн, сцяг (якія б яны ні былі), нацыянальная грошы — не пусты гук, які можна абмяняць на нейкія выгоды. Гэта ўжо каштоўнасці. І дзякаваць за гэта трэба Саюзнай дзяржаве, якая паўнавартасна так і не адбылася.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### ТАЦЦЯНА ШАПУЦЬКА

Прэс-сакратарку зарэгістраванай у Чэхіі арганізацыі «Малады фронт» адлічылі з другога курса юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Афіцыйнай падставай з'яўляецца пропуск заняткаў. Загад на адлічэнне паспяховай студэнткі быў падпісаны пасля яе ўдзелу ў лістападзе ў Форуме грамадзянскай супольнасці ў Брусэлі без дазволу на тое дэканата універсітэта.

Падчас форуму кіраўнік Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леанід Козік абяцаў дапамагчы дзяўчыне і «выйсці на мітынг у цэнтры Мінска», калі яна будзе мець нейкія праблемы з-за візіту. Аднак пакуль што спадар Козік свайго слова не стрымаў.

У падтрымку Таццяны Шапуцькі ўжо выступілі былыя выпускнікі факультэта. Шведская праваабарончая арганізацыя «Ostgruppens» заклікала кіраўніка МЗС Швецыі, якая да канца года старшынстве ў Еўрасаюзе, Карла Більдта «рашуча адрэагаваць на інцыдэнт і патрабаваць вяртання Таццяны Шапуцькі да навучання». Кіраўнік «Ostgruppens» Марцін Угла лічыць, што адлічэнне актывісткі «Маладога Фронту» з'яўляецца відавочным ігнараваннем з боку афіцыйнага Мінска заклікаў ЕС паважаць правы чалавека, а таксама доказам таго, што «беларускі рэжым не хоча дэмакратызаваць краіну».

У 2005 годзе падобны выпадак адбыўся са студэнткай Беларускага эканамічнага універсітэта Таццянай Хомай — дзяўчына праз суд адстойвала свае права вучыцца ва універсітэце, але так і не здолела ўзнавіцца і працягнула навучанне за межамі краіны.

### ВІКТОРЫЯ АЗАРАНКА



Беларуская 20-гадовая тэнісістка Вікторыя Азаранка завяршае гэты сезон на сёмым радку рэйтынгавай табліцы Жаночай тэніснай асацыяцыі (WTA). Топ-ліст узначальвае амерыканка Сірэна Ульямс, на другім месцы расіянка Дзінара Сафіна, замыкае тройку мацнейшых тэнісістак планеты расійская спартсменка Святлана Кузняцова. У першую сотню ўваходзіць яшчэ адна беларуска — 21-гадовая Вольга Гаварцова — яна займае 52-е месца.

У парным рэйтынг-лісце Вікторыя Азаранка займае 15-ю пазіцыю. Іншыя беларускія тэнісісткі знаходзяцца на наступных месцах: Таццяна Пучэк — 55-е, Дар'я Кустава — 72-е, Вольга Гаварцова — 73-е, а Кацярына Дзягілевіч — 76-е.

У гэтым сезоне буйных турніраў WTA больш не будзе, бліжэйшыя спаборніцтвы адбудуцца ў аўстралійскім Брысбене і новазеландскім Оклендзе на пачатку студзеня наступнага года. Першым з турніраў серыі «Вялікага шлема» стане «Australian Open» , які стартуе 18 студзеня 2010 года ў Мельбурне.

### АЛЕГ ПРАЛЯСКОЎСКІ



Журналісцкую супольнасць на гэтым тыдні ўскалыхнула прызначэнне міністрам інфармацыі Алега Праляскоўскага. Афіцыйна чыноўнік змяніў на пасадзе Уладзіміра Русакавіча з-за сыходу апошняга на пенсію. Алег Праляскоўскі да гэтага працаваў кіраўніком Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі прэзідэнта.

Чыноўнік вядомы стварэннем негалосных «чорных спісаў» музыкаў некалькі гадоў таму падчас працы на пасадзе кіраўніка Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі прэзідэнта. У колах недзяржаўных СМІ гэта прызначэнне назвалі пачаткам падрыхтоўкі да бліжэйшай выбарчай кампаніі.

Старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў Жана Літвіна выказала меркаванне, што з прыходам Праляскоўскага сітуацыя ў беларускай медыйнай сферы пагоршыцца. «Вельмі дрэнна, што кіраўніком Міністэрства інфармацыі прызначаны не прафесіянал у сферы масавай інфармацыі, не быў рэдактар якой-небудзь газеты, сайта ці выдання, а менавіта ідэолаг», — адзначыла Літвіна ў інтэрв'ю БелаПАН. Старшыня БАЖ лічыць, што цяпер кантроль за недзяржаўнымі СМІ, якія працуюць у тым ліку ў інтэрнэце, узмоцніцца.

▸ АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# СУЧАСНАЕ БЕЛАРУСКАЕ СЯРЭДНЯВЕЧЧА

Сяргей НІКАЛЮК

**Дзяржава — наша ўсё. Такая афіцыйная версія. На жаль, з ёй даводзіцца пагадзіцца. Чаму «на жаль»? Таму што збудаваная Лукашэнкам дзяржаўная сістэма з'яўляецца галоўнай перашкодай на шляху беларусаў у будучыню.**





Днямі прачытаў у газеце невялікі артыкул з нагоды таніроўкі шкла. Я не аўтамабіліст, таму не ведаў, што тут ёсць праблема. Высвятляецца, ёсць. А калі так, то без кіраўніка дзяржавы яе ніяк не вырашыць. Вось ён і ўмяшаўся, даручыў чыноўнікам падрыхтаваць адпаведны ўказ.

«Мяне цікавіць усё», — так у свой час Лукашэнка ахарактарызаваў уласнае кіраўнічае крэда. Камусьці гэта можа падабацца, камусьці — не, але якім чынам Аляксандр Рыгоравіч пра «усё» даведваецца і якім чынам ён вылучае зерні інфармацыі са смецця? Зразумела, ёсць спецслужбы і іншыя структуры, але наўрад ці яны рыхтуюць аналітычныя нататкі па праблеме таніроўкі шкла.

Працытую фрагмент газетнага артыкула: «На імя кіраўніка дзяржавы паступілі шматлікія звароты з просьбай зняць абмежаванні на таніроўку». У дадзеным выпадку слова «звароты» выступае сінонімам слова «скаргі». І тады пазначаныя вышэй пытанні здымаюцца. Скаргі як сродак зваротнай сувязі з грамадствам беларусы атрымалі ў спадчыну ад бальшавікоў. У савецкі час дзяржаўныя газеты (іншых не было), партыйныя і іншыя «органы» лісты атрымлівалі мяхамі.

Няцяжка здагадацца, што ў асноўным гэта былі скаргі. Адпаведныя штатныя супрацоўнікі іх чыталі і, акрамя адказаў непасрэдна скаржнікам, рыхтавалі аналітычныя нататкі ў вышэйстаячыя інстанцыі. Пры дасягненні крытычнай масы скаргаў па пэўных праблемах наверсе прымаліся адпаведныя рашэнні. Класічны прыклад — прыняцце рашэння пра пачатак будаўніцтва масавага жылля пры Хрушчове.

Але не варта разглядаць бальшавікоў як вынаходнікаў падобнай інфармацыйнай тэхналогіі. Чалабітныя на Русі існавалі задоўга да Івана Жахлівага. Без іх своеасаблівых аналагаў не здольна функцыянаваць і сучасная беларуская дзяржава. Улада мае патрэбу ў зваротнай сувязі з грамадствам, але прадстаўнічыя органы і дзяржаўныя СМІ у Беларусі такую сувязь забяспечыць не ў стане (першыя імітуюць дэмакратыю, другія занятыя прапагандай). Вось і даводзіцца карыстацца сярэднявечным досведам.

Гэтай жа мэце служаць і шматлікія сустрэчы кіраўніка дзяржавы з «працоўнымі калектывамі» — своеасаблівыя аналагі палюддзя — аб'езду князямі Кіеўскай Русі сваіх валадарстваў. Падчас палюддзя князі не толькі знаёміліся са станам спраў на месцах, але і ладзілі суд над нядбайнымі мясцовымі кіраўнікамі. Нагадаю рэпліку, кінутую Лукашэнкам падчас нядаўняга наведвання «Інтэграла»: «Трэба затрымліваць — затрымлівайце, а то мільярды па ветру пускаюць. Усё будзе па законе: калі ёсць за што сядзець — значыць, будуць сядзець».

## У чым сіла, брат?

Паводле афіцыйнай версіі, агучанай на трэцім Усебеларускім народным сходзе, сакрэт нашых поспехаў — у моцнай дзяржаўнай уладзе, моцнай сацыяльнай палітыцы і апоры на народ. Але што з'яўляецца крытэрам моцнай улады? Звернемся да азбукавых паліталагічных ведаў. Любая дзяржаўная ўлада абапіраецца на камбінацыю з трох базавых элементаў — на СІЛУ, ВЕРУ і ЗАКОН. Манархі сярэднявечнай Еўропы ў апошнім кампаненце гэтай трыяды асабліва не мелі патрэбы. ЗАКОН — гэта абавязковы атрыбут рынкавай эканомікі, у аснове якой ляжыць акт куплі-продажу. Здзяйсняецца дадзены акт па згодзе двух РАЎНАПРАЎНЫХ бакоў на падставе ДАМОВЫ. Устойлівых жа адносін дамовы без адпаведнай заканадаўчай базы стварыць яшчэ ніхто не здолеў.

Але сучасная беларуская дзяржава і ў гэтым пытанні не пазбаўлена сярэднявечнай своеасаблівасці. Здавалася б, законаў у Беларусі — што ўвесну апалонікаў у балоце. Але не трэба спяшацца з высновамі. Нашы законы маюць аднабаковую скіраванасць. Іх мэта — умацаванне ўлады, а не падтрыманне правапарадку. Вось чаму на саму ўладу яны не распаўсюджваюцца.

Каб далёка не хадзіць за прыкладам, спашлюся на дзейнасць Усебеларускіх народных сходаў (УНС). У Канстытуцыі пра «вечавы» (характарыстыка Лукашэнкі) інстытут беларускай палітычнай сістэмы не сказана ні слова. Здавалася б, кіраўнік дзяржавы мае права раіцца з кім заўгодна, але ўся справа ў тым, што роля УНС не абмяжоўваецца дарадчай функцыяй. Працытую: «Рашэнні другога Усебеларускага сходу, якія будуць прынятыя вамі, вызначаць асноўныя арыенціры дзейнасці ўсіх дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў краіны» (даклад на другім УНС).

А ўзгадаем наганяй ураду «лайдакоў», калі 30 лістапада ўсім нам лішні раз нагадалі пра неабходнасць абавязковага выканання пяцігадовага плану, прынятага на трэцім УНС. Надыходзяць чарговыя прэзідэнцкія выбары, а значыць, мы зноў станем сведкамі сярэднявечнага антыканстытуцыйнага веча.

Сіла беларускай дзяржавы не ў законе. Яна, па-першае, у шматлікасці карных органаў. А па-другое, у сацыяльнай палітыцы, якая ажыццяўляецца за кошт цэнтралізаванага размеркавання нацыянальнага багацця. Але для таго, каб нешта пераразмяркоўваць, гэта нешта неабходна спачатку сабраць у дзяржаўныя закрамы. **Табліца 1** ілюструе дынаміку дзяржаўнай здольнасці прысабечваць.

Звярніце ўвагу на скачкападобны рост бюджэтных прыбыткаў у 2003 годзе. Адкуль такое шчасце? Ды з «нафтавага афшору». Механізм яго функцыянавання неаднаразова быў апісаны ў прэсе. Але што тут для нас важна? З'яўленне дадатковай крыніцы дзяржаўных прыбыткаў не прывяло да зніжэння падаткаў. Усю крыніцу дзяржава прысвоіла сабе. Перад намі яшчэ адзін прыклад з сярэднявечнага мінулага. Калі князі перасталі плаціць татарам даніну, да змяншэння падатковага цяжару гэта не прывяло. Усё «лішкі» пайшлі на папаўненне кансалідаваных княжацкіх бюджэтаў.

Сіла беларускай дзяржавы шмат у чым вызначаецца здольнасцю кіраўніцтва канцэнтраваць рэсурсы. У 2009 годзе гэта сіла пачала змяншацца. Адсюль і разварот на Захад. Прытым гэты разварот зроблены не да крыніцы каштоўнасцяў, а да крыніцы тэхналогій і інвестыцый. Па такой жа тэхналогіі бацька Пятра I стварыў у Маскве нямецкую слабаду. Высокім плотам яна была абнесена невыпадкова.

**ТАБЛІЦА 1.** ПРЫБЫТКІ КАНСАЛІДАВАНАГА БЮДЖЭТУ, % ВУП

| 1995 | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 | 2009 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 29,2 | 33,5 | 33,0 | 33,4 | 44,1 | 47,4 | 47,4 | 48,4 | 49,6 | 51,2 | 44,4 |

**ТАБЛІЦА 2.** НА ВАШ ПОГЛЯД, НА КАГО ПЕРШ ЗА ЎСЁ АБАПІРАЕЦЦА ПРЭЗІДЭНТ А. ЛУКАШЭНКА?

| Варыянт адказу | 08'06 | 09'09 | +/– |
|---|---|---|---|
| На прэзідэнцкую «вертыкаль» | 37 | 40 | 3 |
| На вайскоўцаў, МУС, КДБ | 49 | 38 | –11 |
| На пенсіянераў | 41 | 38 | –3 |
| На дзяржаўных чыноўнікаў | 21 | 27 | 6 |
| На простых людзей | 34 | 24 | –10 |
| На вяскоўцаў | 30 | 24 | –6 |
| На дырэктараў буйных прадпрыемстваў | 13 | 13 | 0 |
| На спецыялістаў | 10 | 8 | –2 |
| На культурную і навуковую эліту | 8 | 4 | –4 |
| На бізнесменаў | 5 | 2 | –3 |

## Не працуем, а служым

Пераход Еўропы ад сярэднявечча да прамысловай рэвалюцыі стаў магчымым пасля таго, як людзі творчыя і прадпрымальныя перасталі лічыцца людзьмі другога гатунку, што, у прыватнасці, азначала немагчымасць канфіскацыі іх уласнасці толькі на падставе рашэння найсвятлейшых асобаў. Тут будзе дарэчы прывесці цытату з апошняй кнігі амерыканскага эканаміста Лала Дзіпака «Вяртанне нябачнай рукі»: «Хоць купцы і рынкі (гандляры і кірмашы) тысячагоддзямі існавалі ва ўсіх еўразійскіх аграрных цывілізацыях, рынкавая эканоміка магла паўстаць толькі пасля таго, як задавальненне пэўных патрэбаў таварнай гаспадаркі — «абарона ўласнасці і абарона кантрактаў» — стала адной з функцый палітычнай сістэмы».

Беларуская палітычная сістэма гэту функцыю не асвоіла і зараз. Яна разглядае прадпрымальнікаў як сваіх падданых, якія ёй увесь час штосьці вінаватыя. На дварэ XXI стагоддзе, а сучаснага інстытута прыватнай уласнасці ў Беларусі як не было, так і няма. Прывяду толькі адно выказванне Лукашэнкі, што характарызуе яго сярэднявечны светапогляд: «З прыватнікам размаўляць заўсёды лягчэй. Яму сказаў — ён зробіць. Таму што, па вялікім рахунку, рызыкуе ў адваротным выпадку страціць сваю ўласнасць».

Паўтараю, у Беларусі няма прыватнай уласнасці. Ёсць уласнасць службовая. Пэўныя асобы могуць ёй валодаць выключна на ўмовах службы дзяржаве. Хто гэту ісціну не засвоіў, як Хадаркоўскі ў Расіі, у лепшым выпадку губляе ўласнасць. Са сказанага вынікае, што большасць беларусаў не працуюць, а служаць. Іх служба аплачваецца не па працы (такая аплата магчыма толькі ў рынкавай эканоміцы), а на аснове распрацаваных службоўцамі нарматываў. Без праслаўтай стаўкі першага разраду, з якой, як Дон Кіхот з ветракам, змагаюцца беларускія ліберальныя эканамісты, тут не абысціся.

Сярэднявечную прыроду беларускай улады ўсведамляюць не толькі аналітыкі, але і грамадства. У чарговы раз звярнуся па дапамогу да НІСЭПД (**Табліца 2**). На каго абапіраецца Лукашэнка? Большасць беларусаў лічыць, што на «вертыкальшчыкаў» (чыноўнікаў), сілавікоў і пенсіянераў. А хто ў нас у канцы спісу? Нескладана здагадацца, што ў канцы спісу тыя, хто па «службовым абавязку» ў сучасным свеце ўносіць асноўны ўнёсак у эканамічнае развіццё: кіраўнікі прадпрыемстваў, спецыялісты, навуковая і культурная эліта. Бізнесмены ж, гэтыя «вашывыя блохі» беларускай эканомікі, у верасні 2009 года наогул не змаглі пераадолець бар'ер статыстычнай памылкі ў 3 працэнта.

З восені 2007 года ўлада загаварыла пра лібералізацыю. Першапрычынай падобных размоваў паслужыла беларуска-расійская нафтагазавая «вайна». За размовамі адбыліся і першыя нясмелыя рэформы. Сусветны крызіс быў тут вельмі нават дарэчы. Ён выступіў у якасці своеасаблівага каталізатара працэсу лібералізацыі, які, аднак, не адмяніў традыцыйных для беларускай дзяржавы сярэднявечных кіраўнічых практык.

Прыглядзімся да трэцяй калонкі **Табліцы 2.** Крызіс дэвальваваў «апорныя функцыі» большасці сацыяльных груп. «Вертыкальшчыкі» і чыноўнікі — выключэнне. На іх і ўсклаў Лукашэнка асноўную адказнасць за мадэрнізацыю. У рамках сярэднявечнай парадыгмы такое рашэнне выглядае вельмі лагічным.

МЕРКАВАННЕ

# Войцэх Бародзіч-Смаліньскі: ЗА САНКЦЫЯМІ СУПРАЦЬ БЕЛАРУСІ СТАЯЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ПЫТАННІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

**Польшча была адным з ініцыятараў актывізацыі стасункаў паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам. Цяперашні кіраўнік еўрапейскага парламента Ежы Бузэк перыядычна звяртаецца да тэмы супрацоўніцтва з Беларуссю, пытанняў унутранай і знешняй палітыкі дзяржавы. Пра прагматычныя разлікі і ідэалістычныя чаканні ад дыялогу Беларусі і Еўрапейскага саюза разважае супрацоўнік польскага Цэнтра міжнародных адносін, кіраўнік усходняй праграмы Войцэх Бародзіч-Смаліньскі.**



**Даведка:**
Войцэх Бародзіч-Смаліньскі — выпускнік Еўрапейскага Цэнтра Варшаўскага універсітэта, выпускнік польскай Акадэміі дзяржаўнай абароны; быў каардынатарам праекту «Партнёрства для Еўропы — Польшча–Беларусь» польскай Фундацыі імя Р. Шумана, з'яўляецца супрацоўнікам Цэнтра міжнародных адносінаў, кіраўніком усходняй праграмы ў Цэнтры міжнародных адносінаў.

***— У лістападзе Еўрапейскі саюз падоўжыў частковае прыпыненне санкцый у дачыненні да беларускіх чыноўнікаў і дзеянне санкцый да кастрычніка 2010 года. Цяпер, калі размова ідзе пра беларуска-еўрапейскія адносіны, надзвычай папулярным з'яўляецца выраз «адчыненае вакно магчымасцяў». Што Вы за ім бачыце?***

— Больш за паўгода ў Беларусі назіраецца пазітыўнейшае стаўленне да Еўрапейскага саюза і да актыўнасці, звязанай з ЕС. Гэта, канешне, радуе. Калі чалавек прыязджае ў Беларусь, то на першы погляд падаецца, нібыта тут усё добра і падстаў для санкцый быццам бы няма. Каб зразумець, што адбываецца ў краіне і якія праблемы маюць людзі, трэба пажыць, паназіраць за ўсім. На жаль, большасць чыноўнікаў ЕС такой магчымасці не мае. Яны сустракаюцца толькі з прадстаўнікамі беларускіх уладаў, апазіцыі, часам НДА.

Праблема ў тым, што за санкцыямі супраць Беларусі стаяць не толькі пытанні правоў чалавека, дэмакратыі. Цяпер Еўрасаюз зацікаўлены ў тым, каб як мага больш завязаць Беларусь на сябе, каб краіна была адкрытая да эканамічнага супрацоўніцтва. Праз гэта падаецца, што Беларусь крок за крокам набліжаецца да ЕС. Таксама я думаю, што пэўную ролю ў змене падыходу Захаду да Беларусі адыграла жаданне ўладаў палепшыць свой знешні імідж, праца ў галіне самапіяру.

***— Ці змяніліся ў Польшчы адносіны да Беларусі?***

— Мы пазітыўна ставімся да беларусаў і ўкраінцаў. Да расіян таксама, але ёсць негатыўнае ўспрыманне расійскай улады. Я б сказаў, што ў Польшчы ёсць «дзве Польшчы», як і «дзве Беларусі» ў вашай дзяржаве. Адны палякі ездзяць у Беларусь, маюць эканамічныя ці проста чалавечыя кантакты з беларусамі, адпаведна, больш аб'ектыўна ўспрымаюць краіну і тое, што ў ёй адбываецца. «Другая Польшча» трымаецца думкі, што тут аўтарытарная краіна, няма добрых дарог і гэтак далей. І вось гэта другое меркаванне трэба мяняць. Натуральна, у вас не ўсё ідэальна, але і не так дрэнна, як падаецца часам з-за мяжы.

***— Удзел у праграме «Усходняе партнёрства» тэарэтычна можа быць шляхам да сяброўства ў ЕС?***

— Праграма «Усходняе партнёрства» не адчыняе дзверы на ўступленне ў Еўрасаюз ніводнай краіне-партнёру, а не толькі Беларусі. «Усходняе партнёрства» не з'яўляецца шляхам уступлення ў ЕС, а ёсць спробай прывязаць кожную з краін-партнёраў да ЕС як мага больш. Да таго ж гэта дазваляе зрабіць пэўны жэст у бок Расіі, нагадаць, што Еўрасаюз існуе на геапалітычнай прасторы.

Таксама «Усходняе партнёрства» стварае магчымасці для міждзяржаўнага супрацоўніцтва ў шэрагу галінаў. Але як будуць гэтыя магчымасці скарыстаныя, залежыць найперш ад уладаў кожнай краіны-партнёра. Я ведаю, што беларускія ўлады вельмі актыўна дасылаюць у структуры ЕС розныя праекты, хочуць зруху ў сферы рэкламы і самапіяру краіны. Для іх «Усходняе партнёрства» — найперш магчымасць увайсці ў еўрапейскі кантэкст і праз гэта забяспечыць вырашэнне ўласных інтарэсаў.

***— Многа размоў вялося наконт беларускай «здрады» з ЕС. Даволі нервовая рэакцыя Расіі была і на «Усходняе партнёрства». Але ці маюць грунт гэтыя перажыванні?***

— Гульня ў балансаванне паміж Еўропай і Расіяй цягнецца шмат гадоў, і беларускія ўлады добра выкарыстоўваюць слабыя бакі партнёраў. Праблема хутчэй у тым, што прапановы Еўрапейскага саюза менш прывабныя з эканамічнага пункту гледзішча за расійскія. Расія дае грошы, Еўропе наўзамен фінансавай падтрымкі патрэбныя транспарэнтнасць, справаздачнасць, адказнасць. І ў ЕС, здаецца, пакуль не разумеюць гэтай сітуацыі. Адна з ідэй «Усходняга партнёрства» мае на мэце ўніфікацыю заканадаўства шасці краін-партнёраў з еўрапейскім. Гэта фактычна рыхтуе краіны да ўступлення ў ЕС. Але ўніфікацыя заканадаўства — сама па сабе дарагая справа, паралельна з гэтым мусяць адбывацца пэўныя ўнутраныя і знешнія трансфармацыі, якія таксама вымагаюць выдаткаў.

Мне здаецца, што ў ЕС пакуль не зразумелі, што ўлады краін-партнёраў таксама ўмеюць лічыць грошы, улічваць эканамічную мэтазгоднасць. Яны не будуць ініцыяваць інтэграцыю з Захадам, калі не пабачаць сур'ёзных крокаў насустрач.

***— Пасля Форуму грамадзянскай супольнасці стала зразумела, што мае месца канфлікт прадстаўнікасці Беларусі ў ЕС: і няўрадавыя арганізацыі, і афіцыйны Мінск імкнуцца займець ініцыятыву ў гэтай сферы. Чаго можна чакаць з такім раскладам?***

— Гэта не выключна беларуская праблема. Такое ж неаднадумства існуе і ў Польшчы, і ў іншых краінах. Праблема палягае ў корані «Усходняга партнёрства», якое пачыналася з размоў на міжурадавым узроўні. Ёсць многа экспертаў, якія працуюць на афіцыйныя структуры, яны ж пэўны час займаліся прасоўваннем гэтай тэматыкі і застаюцца ў ёй.

Калі быў арганізаваны гэты форум, стала зразумела, што прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці маюць зусім іншы, чым ЕС і ўлады, погляд на справы і супрацоўніцтва паміж краінамі. Ніхто з грамадзянскай супольнасці краін-партнёраў не ведаў, што робяць іх урады ў межах чатырох платформаў праграмы. Пытанне найперш у тым, як гэту сітуацыю развязаць. Для Беларусі гэта задача больш складаная, чым, напрыклад, для Украіны. Але для мяне пазітыўным быў той факт, што ў працу беларускай дэлегацыі актыўна ўключыліся прадстаўнікі афіцыйных арганізацый. Хацелася, каб такіх асобаў і арганізацый было больш, тады можна было б дасягнуць пагаднення.

***— Адзін з заходніх даследчыкаў выказаў меркаванне, што каляровая рэвалюцыя ў Беларусі немагчымая, бо беларусы ў прынцыпе задаволены бягучым станам рэчаў. Што на гэты конт думаеце вы?***

— Цяжка прадказваць, ці будуць бліжэйшым часам змены ў краіне. Але калі прааналізаваць вынікі розных сацыялагічных даследаванняў, то бачна, што беларусам у найноўшай гісторыі ніколі не жылося так добра, як за ўрадам Лукашэнкі. Узровень заробкаў, пенсіяў, дабрабыту паступова расце. Канешне, ёсць кепскія моманты, але эканамічныя індыкатары гавораць пра тое, што беларусы цяжка ставяцца да зменаў. Я лічу, што беларускі народ разумны, таму ўсведамляе, што яго цяперашняе кіраўніцтва не самае лепшае, але альтэрнатывы няма.

Натуральна, можна гаварыць, што няма незалежных СМІ, тэлебачанне манапалізаванае, доступ да інфармацыі абмежаваны і г. д. Але калі нехта хоча атрымаць альтэрнатыўную інфармацыю, то ў цяперашнім свеце гэта нескладана: можна пераключыць тэлевізар на іншы канал, можна чытаць навіны ў інтэрнэце. Тым больш, што доступ да інтэрнэту ў Беларусі ўвесь час расце. Праблема не толькі ў несвабодзе СМІ. Беларусы ведаюць, што ёсць нейкая апазіцыя, але не ўсе разумеюць, ці яна змагаецца паміж сабою, ці з уладамі. І гэта наводзіць на думкі, ці не будзе новая ўлада горшай?

З усяго гэтага я прыходжу да высновы, што падчас бліжэйшых прэзідэнцкіх выбараў пераменаў не будзе. Натуральна, можна меркаваць, што абвострыцца эканамічнае становішча, і гэта прымусіць людзей захацець змяніць кіраўніцтва. Але пакуль я не бачу такога варыянту.

***— З тых асобаў, што заявілі пра свае магчымы ўдзел у бліжэйшых прэзідэнцкіх выбарах, хто мае найбольш шансаў?***

— Яшчэ не ўсе патэнцыйныя кандыдаты вядомыя, таксама варта пагладзець, як будуць рэалізоўвацца змены ў выбарчым заканадаўстве. З магчымых апазіцыйных кандыдатаў самым дасведчаным з'яўляецца Аляксандр Мілінкевіч. Ёсць і маладыя патэнцыйныя кандыдаты, яны новыя і верагодна могуць змяніць сітуацыю. Але, зноў жа, расклад робіцца ў межах 15–20 працэнтаў, якія заўжды падтрымліваюць апазіцыю. На жаль, большага пакуль не прадбачыцца.

***— Ёсць інфармацыя, што падчас свайго старшынства ў Еўрасаюзе Польшча ўздыме пытанне пра стварэнне ініцыятывы па бяспецы ў Еўропе. Ужо вядома, што гэта будзе за ініцыятыва?***

— Цяпер ствараецца многа ініцыятыў, якія будуць прадстаўленыя падчас польскага старшынства. Але канкрэтна нічога не вядома, усё яны знаходзяцца ў міністэрствах у стадыі распрацоўкі. Здаецца, што гэта ініцыятыва будзе прадугледжваць стварэнне супольных еўрапейскіх вайсковых сілаў. У межах ЕС існуе некалькі супольных дывізій, якія маюць права і абавязак абараняць Еўропу ў крытычных выпадках. Падрабязнасці па новай ініцыятыве будуць вядомыя ў лютым наступнага года, калі ўсё больш праясніцца.

▸ ВЫЖЫВАННЕ

# ЛЮДЗІ НА СМЕТНІКУ

Іван БАРЫСАЎ

**Апошнім часам да жыхароў вёсак, якія знаходзяцца непадалёк ад раённага палігона па захоўванню цвёрдых бытавых адыходаў — сметніка, што размяшчаецца ў кар'ерах каля вёскі Асавец, — усё часцей звяртаюцца нідзе не працуючыя грамадзяне, якія прапаноўваюць набыць па танным кошце сыр, якім, нібыта, вельмі добра карміць хатніх птушак і свіней.**

Толькі да мяне асабіста (а я жыву ў вёсцы Вялікая Машчаніца) на мінулым тыдні з такой прапановай звярнуліся дзве асобы. Ад прапановы я адмовіўся, але сам факт мяне як журналіста вельмі зацікавіў.

Ні для каго з жыхароў навакольных вёсак не з'яўляецца вялікім сакрэтам, што Бялыніцкі раённы сметнік каля Асаўца з'яўляецца своеасаблівым «прыіскам» для пэўнай катэгорыі людзей, якія жывуць за кошт здабытых на гэтым «радовішчы» «карысных выкапняў». Калі прыязджаюць машыны, што вывозяць смецце з гарадскога пасёлка або навакольных вёсак, адразу ж збіраецца больш за два дзесяткі «стараценяў», якія, нібыта тыя мурашы, пачынаюць здабываць неабходныя рэчы: бутэлькі, металы (асабліва каляровыя), рыззё, паперу, адзенне, абутак і іншае. Некаторыя спецыялізуюцца на прадуктах харчавання — у асобныя дні, калі ў крамах выкідаюць пратэрмінаваныя прадукты, у машынах смеццем са аказваецца вельмі шмат гэтых «далікатэсаў». Карціна, паверце мне, вельмі цікавая, бо, каб напісаць гэты матэрыял, я сам пабываў на гэтым «прыіску», паназіраў за падзеямі і паразмаўляў з людзьмі.

Падчас гутаркі высветлілася, што для многіх з іх сметнік з'яўляецца адзінай крыніцай атрымання прыбытку, асабліва ў зімовыя і вясновыя месяцы, калі няма грыбоў і ягад. Некаторыя працуюць пад заказ, здабываючы менавіта тое, што замовіў кліент, для наступнай рэалізацыі. Так, напрыклад, некалькі жыхароў Асаўца выбіраюць прадукты харчавання (часцей за ўсё, сыр), пасля чаго за таварам на асабістым аўтамабілі прыязджае пакупнік, які разлічваецца за яго і забірае цалкам. Як кажуць самі «капальнікі», потым пакупнік выкарыстоўвае набытак для адкорму ўласнай жывёлы.

Частку прадуктаў разносяць людзям па папярэдняй замове. Сыр жа карыстаецца асаблівым попытам, яго многія з жыхароў навакольных вёсак купляюць, каб потым карміць уласных курэй.

Большыня ж выкарыстоўвае здабытыя на сметніку прадукты для ўласнага харчавання. Шмат хто і апранаецца ў знойдзеныя на сметніку рэчы. Бутэлькі, рыззё і паперу часцей за ўсё рэалізуюць у крамах спажывецкай кааперацыі, каляровыя металы — так званым скупшчыкам.

Дарэчы, людзі, што прыходзяць на сметнік, дакладна ведаюць, у які дзень і адкуль прыйдзе пэўная машына. Так, па чацвяргах прывозяць вельмі шмат прадуктаў харчавання, асабліва прадукцыі Бялыніцкага філіяла ААТ «Бабуліна крынка».

Як адзначылі «капальнікі» Вольга і Міхаіл, у апошнія тыдні колькасць менавіта гэтай прадукцыі чамусьці рэзка ўзрасла, таму яны і пачалі прапаноўваць яе новым людзям з навакольных вёсак, звяртаючыся ў першую чаргу да тых, хто трымае хатнюю жывёлу і птушку.



Photo.ByMedia.Net

Але ў мяне асабіста ўзнікае яшчэ адно пытанне: навошта даводзіць справу да таго, каб столькі прадуктаў харчавання (паверце мне на слова, там іх шмат, прычым вельмі разнастайных) выкідалася разам са смеццем? Няўжо наша раённае спажывецкае таварыства, прыватныя ўладальнікі крамаў, індывідуальныя прадпрымальнікі не ведаюць доследу нашых суседзяў з-за мяжы? Там за пэўны час да заканчэння тэрміну захоўвання кошты на прадукты рэзка зніжаюцца, і якасны тавар можна набыць нашмат танней. Задаволеныя ўсе: пакупнікі, таму што з'эканомілі грошы, прадаўцы, што атрымалі за свой тавар хоць штосьці.

У нас, на жаль, часцей адбываецца іншае: або сапсаваныя прадукты спрабуюць рэалізаваць пакупніку, або чакаюць таго моманту, калі іх можна толькі выкінуць на сметнік (як правіла, гэта звычайна робіцца напярэдадні візіту кантралюючых органаў). Кажу пра гэта са ўсёй адказнасцю, сам не так даўно набыў у краме ў Казіміраўцы вэнджаны селядзец, які давялося выкінуць, як толькі разрэзаў. Пра што думаюць гандляры, калі прадаюць такі тавар, я не ведаю, бо, зразумела, больш я ў гэту краму ніколі не зайду. Дый шмат хто з вас, паважаныя чытачы, трапляў у падобныя сітуацыі, пра парушэнне правіл гандлю пастаянна пішуць у сваіх матэрыялах і супрацоўнікі камітэта дзяржкантролю.

Аднак гэта тэма ўжо іншага артыкула, да яе мы абавязкова яшчэ вернемся ў бліжэйшы час.

▸ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА

# СЕМ'І ЗАСТАНУЦЦА БЕЗ ГРОШАЙ

Барыс ВЫРВІЧ

**На працягу года паўтузіна жыхароў Бялыніцкага раёна асуджаны за занятак незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю. Яны панеслі пакаранне за тое, што набывалі за межамі нашай краіны ад свайго імя і па даверанасцях грамадзян легкавыя аўтамабілі і потым рэалізоўвалі іх. А працей — людзей абвінавацілі ў тым, што яны ганялі машыны на продаж, не зарэгістраваўшыся ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка.**

Усе судовыя працэсы адбываліся паісках Бялыніцкай раённай інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь. У якасці адказчыкаў выступалі бялынічане, якія займаліся перагонкай машын у перыяд з 2004 па 2007 год, у прыватнасці Уладзімір К., Мікалай А., Андрэй Б., Леанід А., Сяргей Л., Юрый Д. і Уладзімір Н.

Ніякіх іншых правапарушэнняў за гэтымі бялыніцкімі хлопцамі раней не назіралася, больш за тое, некаторыя з іх раней самі працавалі ў праваахоўных органах, асобныя зараз працуюць педагогамі ў навучальных установах Бялыніцкага раёна.



Photo.ByMedia.Net

Адразу адзначу, што суд Бялыніцкага раёна прызнаў усіх вінаватымі, яны атрымалі розныя тэрміны зняволення ўмоўна, на пэўны перыяд ім забаронена займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю. Але самае галоўнае — з іх спагнана ў даход дзяржавы больш за пяцьсот мільёнаў рублёў. Акрамя таго, кожны з асуджаных абавязаны заплаціць вельмі значную дзяржпошліну (ад аднаго да шасці з паловай мільёнаў рублёў) і аплаціць працэсуальныя выдаткі.

Асабіста я прысутнічаў на судовым працэсе, на якім разглядалася справа Уладзіміра Н., майстра вытворчага навучання Машчаніцкага ВВК. Пасяджэнні суда адбываліся на працягу амаль цэлага месяца, інтарэсы дзяржавы прадстаўляла супрацоўніца Бялыніцкай раённай інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

На судзе былі агучаныя доказы пра тое, што на працягу 2004–2007 гадоў абвінавачаны прыгнаў з-за мяжы чатырнаццаць легкавых аўтамабіляў розных марак, аднак абвінавачванне ў незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці было вылучана па факту прыгону сямі аўтамабіляў. Гэтыя аўтамабілі абвінавачаны прыгнаў з-за мяжы з красавіка 2005 па жнівень 2006 года, у асноўным усе яны былі набыты па даверанасцях блізкіх сваякоў Уладзіміра.

Падчас судовага пасяджэння апыталі шэраг сведкаў, як асоб, па даверанасцях якіх набываліся аўтамабілі, так і людзей, якім гэтыя машыны былі рэалізаваныя. Усе людзі, якія набылі аўтамабілі і давалі паказанні ў судзе, казалі пра тое, што яны былі цалкам задаволены якасцю набытых аўтамашын. Асобы, якія афармлялі даверанасці на Уладзіміра Н., сцвярджалі, што машыны яны набывалі для сябе асабіста, а прадаць іх былі вымушаны вельмі хутка ў выніку складаных фінансавых абставін. Аднак суд палічыў гэтыя паказанні непераканаўчымі і цалкам падтрымаў дзяржаўнага абвінаваўцу Наталлю Нікалаенка.

За занятак незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю Уладзімір Н. асуджаны на два гады абмежавання волі, пазбаўлены права займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю на працягу чатырох гадоў. Гэты ж прысуд задаволіў іск дзяржаўнага абвінаваўцы пра спагнанне з абвінавачанага ў даход дзяржавы 36 057 064 рублёў неабгрунтавана атрыманага ім даходу і 1 мільён 802 тысячы рублёў дзяржпошліны. Таксама з Уладзіміра будуць спагнаны працэсуальныя выдаткі ў суме 17 820 рублёў.

Для забеспячэння выканання рашэння пра спагнанне іску накладзены арышт на дом Уладзіміра Н., а таксама на два аўтамабілі, якія зарэгістраваны на яго імя.

Уладзімір карыстаецца павагай у сваіх калег па працы з Машчаніцкага ВВК. На ўтрыманні ў яго знаходзіцца двое дзяцей 18 і 9-гадовага ўзросту, жонка працуе настаўніцай у Бялыніцкай СШ № 2. Ён абавязкова будзе абскарджваць рашэнне суда Бялыніцкага раёна ў Магілёўскім абласным судзе.

Уладзімір Н. таксама адзначыў, што аўтамабіляў, на якія накладзены арышт, фактычна ў яго няма. Адзін належыць яго жонцы, другі — ужо год як прададзены іншаму жыхару Бялыніч Мікалаю М.

Дарэчы, такая ж сітуацыя складваецца і ў некаторых іншых асуджаных за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць жыхароў Бялыніцкага раёна. Арышт накладзены на аўтамабілі, якія фактычна ўжо даўно належаць іншым людзям.

Я не магу паставіць пад сумнеў рашэнне суда. Закон ёсць закон, і выконваць яго патрэбна. Аднак у мяне адразу ўзнікаюць пытанні да нашай паважанай інспекцыі па падатках і зборах. Няўжо Бялынічы — мільённы горад, няўжо немагчыма было адразу папярэдзіць людзей, якія пачалі прыганяць машыны з-за мяжы, пра тое, што яны дзейнічаюць супрацьзаконна? Ды не, у Бялынічах пражывае дзесяць тысяч чалавек, амаль кожны кожнага ведае, а штат супрацоўнікаў раённай інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах дастаткова, каб асабіста паразмаўляць з кожным патэнцыйным правапарушальнікам.

Таксама выклікае здзіўленне, чаму нашы паважаныя падаткавікі не спынілі супрацьзаконную дзейнасць адразу, а цягнулі некалькі гадоў. Як я разумею, ніхто з асуджаных не ўвозіў машыны партызанскімі сцежкамі, усе аўтамабілі абсалютна легальна перасякалі дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь, за іх плаціліся мыты, яны рэгістраваліся ў Дзяржаўтаінспекцыі.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 14 СНЕЖНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.10** Nota Bene.
**09.40** «Зорныя танцы». «Жаночы сезон».
**11.00** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**12.10** Меладрама «Клінч» (Расія).
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Культурныя людзі.
**15.55** Здароўе.
**16.25** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.25** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**18.50, 00.05** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50** Адмысловы рэпартаж АТН «Жывая вада».
**22.05** Драматычны серыял «Часткі цела».
**00.10** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Рэкламная паўза».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Ералаш.
**16.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**18.55** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Зімовая серыя гульняў.
**23.20** Нашы навіны.
**23.35** Навіны спорту.
**23.40** «Злачынствы стагоддзя».
**00.15** Прафесійны бокс (ЗША).
**01.15** Нашы навіны.
**01.30** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.50** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.05** «Далёкія сваякі».
**15.30** «Гарачы лёд».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Я - вандроўца».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Трывожны адпачынак адваката Ларынай». Украіна, 2008г.
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Гучная справа».

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Дак.фільм «Гэты дзіўны свет» (Беларускае тэлебачанне).
**08.35** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Рамантычная камедыя «Законы прывабнасці» (Вялікабрытанія-Ірландыя).
**12.05** «Пра мастацтва».
**12.35** Школа рамонту.
**13.30** Мультфільм.
**13.40** Мультсерыял «Аладзін». 1-я серыя.
**14.05** «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс.
**14.15** Пазакласная гадзіна.
**14.35** Бухта капітанаў.
**15.10** Тэлебарометр.
**15.30** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Кінараман «Дарагі мой чалавек».
**21.25** Калыханка.
**21.40** Беларуская часіна.
**22.45** Дак.фільм «Палатно даўжынёю ў жыццё» (Беларускае тэлебачанне).
**23.00** Хакей. Формула гульні.
**23.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**00.25** Серыял «На рагу ў Патрыяршых-3» (Расія). Заключная серыя.

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!.
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Выключна навука. Ніякай палітыкі. Андрэй Сахараў». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
**12.00** Меладрама «Танга на два галасы».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**15.20** Фільм «Аповесць непагашанага месяца».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Тэлесерыял «Адкрыйце, міліцыя!».
**22.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**23.45** Навіны - Беларусь.
**23.55** «Весткі+».
**00.15** «Мой срэбны шар»..

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.40** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**09.10** «Рускія сенсацыі».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.10** «Кулінарны паядынак».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Ліцейны».
**21.50** Дэтэктыўны серыял «Адзін цень на дваіх».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Сумленны панядзелак».
**00.20** «Школа зласлоўя».

EUROSPORT

**09.30** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**09.35** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**10.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**11.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. Гарахаў (Чэхія).
**12.45** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**14.30** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе. Стамбул (Турцыя). Дзень 04.
**16.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. Гарахаў (Чэхія).
**17.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**18.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**21.15** Футбол. Госць тыдня. Часопіс.
**21.35** Вось дык так!!!
**21.45** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**22.15** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.15** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**00.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. Гарахаў (Чэхія).
**01.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.10** Дакументальная гадзіна: «Мая дачка – тэрарыстка», дак. фільм, 2007 г., Данія.
**20.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Госць «Белсату».
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Мачука», маст. фільм, 2004 г., Чылі–Іспанія.
**23.15** Аб'ектыў.

## 15 СНЕЖНЯ, АЎТОРАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.05** Серыял «Блудныя дзеці» (Расія).
**09.55** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Жывая вада».
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША-Вялікабрытанія).
**13.10** Дэтэктыўны серыял «Вероніка Марс-3» (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Беларускі спорт. Паўналецце».
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Турэцкага» (Расія).
**16.45** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.05** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Серыял «Блудныя дзеці» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Драматычны серыял «Часткі цела».
**00.05** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.05** Тэорыя неверагоднасці.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**18.55** «Рудая». Шматсер. фільм. Закл. серыя.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Лапушкі». Шматсер. фільм.
**22.10** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Зімовая серыя гульняў.
**23.30** Нашы навіны.
**23.45** Навіны спорту.
**23.50** «Зваротны адлік».
**00.25** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.55** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.20** Нашы навіны.
**01.35** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Трывожны адпачынак адваката Ларынай». Украіна, 2008г.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.50** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Крокі да поспеху».
**14.40** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Top Gear. Руская версія».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** «Правілы згону». Серыял.
**22.00** СТВ прадстаўляе: «З чаго пачынаецца Радзіма».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Надзвычайныя гісторыі».
**23.55** «Рэдакцыя». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Дак.фільм «Мама» (БТ).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Дак.-пазнавальны фільм «Дзюгані і ламанцыны. Браты з рознымі лёсамі» (Францыя).
**11.30** «Запал па культуры».
**12.10** Хакей. Формула гульні.
**12.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**13.35** Кінаспробы.
**13.55** Мультсерыял «Аладзін». 2-я серыя.
**14.20** «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс.
**14.30** Пазакласная гадзіна.
**14.50** Свая кампанія.
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Гераіка-прыгодніцкі фільм «Атрад адмысловага прызначэння» (СССР).
**20.50** Калыханка.
**21.05** Беларуская часіна.
**22.10** Спорт-кадр.
**22.40** Серыял «На рагу ў Патрыяршых-4» (Расія). 1-я серыя.
**23.35** Баскетбол. «Еўрачэлэндж». БК «Мінск-2006» (Беларусь) - «Чырвоныя крылы» (Расія).

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!.
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** Прэм'ера. «Ірына Антанава. Мемуары». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**11.45** Тэлесерыял «Адкрыйце, міліцыя!».
**13.20** «Гарадок». Дайджэст.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**15.20** Тэлесерыял «Бухта Філіпа».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Тэлесерыял «Адкрыйце, міліцыя!».
**22.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі+».
**00.00** Прэм'ера. «Галоўная таямніца. Рэспубліка ШКІД». Дакументальны фільм.

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.40** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**09.10** Вострасюжэтны серыял «Ліцейны».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.10** «Кватэрнае пытанне».
**12.05** «Савецкія біяграфіі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Ліцейны».
**21.50** Дэтэктыўны серыял «Адзін цень на дваіх».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Вочная стаўка».
**00.15** «Асабліва небяспечны!».

EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфорд (Вялікабрытанія). Фінал.
**12.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**13.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. Гарахаў (Чэхія).
**14.15** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**15.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**16.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**17.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. Гарахаў (Чэхія).
**18.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Ралі. «Мэта - Дакар». Часопіс.
**20.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**22.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBA. ЗША.
**00.00** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**00.15** Ралі. Ралійная серыя IRC. Агляд сезону.
**00.45** Супербайк. Чэмпіянат свету. Агляд.
**01.45** Лыжнае дваяборствa. Кубак свету. Гонка па сістэме Гундэрсена (Чэхія).

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** МакраФон: XIV Фестываль песеннай паэзіі і аўтарскай песні «Бардаўская восень–2007»: выступ Лявона Вольскага, ч. 02.
**19.40** Тыдзень з радыё «Свабода».
**20.10** Акно ў Еўропу.
**20.40** Асабісты капітал.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Невядомая Беларусь: «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь, ч. 01.
**21.55** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**22.10** Героі не нашага часу: Сяргей Картэс. Аўтаномія асобы.
**22.25** Маю права (прававаяя праграма).
**22.40** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 16 СНЕЖНЯ, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**06.45, 07.45** Зона X.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Вострасюжэтны серыял «Блудныя дзеці» (Расія).
**09.55** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.35** Алімпійскі часопіс.
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША-Вялікабрытанія).
**13.10** Дэтэктыўны серыял «Вероніка Марс-3» (ЗША).
**14.05** Альманах вандраванняў.
**14.25** Мастацка-публіцыстычны фільм «Сівая легенда Уладзіміра Караткевіча».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Людзі на мяжы. Саюзная мяжа».
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Турэцкага» (Расія).
**16.45** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.00** «Зона X». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Зямельнае пытанне».
**19.50** Вострасюжэтны серыял «Блудныя дзеці» (Расія).
**20.50** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** Панарама.
**21.50** Драматычны вострасюжэтны серыял «Часткі цела» (ЗША).
**00.05** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**10.00-16.00** Тэхнічная прафілактыка.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**18.55** Прэм'ера. «Слова жанчыне». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Лапушкі». Шматсер. фільм.
**22.10** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Зімовая серыя гульняў.
**23.30** Нашы навіны.
**23.45** Навіны спорту.
**23.50** «Дакументальны дэтэктыў».
**00.25** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.50** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.15** Нашы навіны.
**01.30** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Рэдакцыя». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.50** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Ваенная таямніца».
**14.40** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Правілы згону». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Дабро пажаліцца».
**20.55** «Правілы згону». Серыял. Закл. серыя.
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**23.55** «Рэдакцыя». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.00** У гэты дзень.
**09.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Манчэстэр Юнайтэд - Вулверхэмптан.
**12.00** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.40** Спорт-кадр.
**13.15** Мультфільм.
**13.35** Мультсерыял «Аладзін». 3-я серыя.
**14.00** «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс для дзяцей (Расія).
**14.10** Пазакласная гадзіна.
**14.25** «Лабірынты гісторыі беларускіх яўрэяў». Частка першая.
**14.55** Медычныя таямніцы.
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія-Швейцарыя).
**16.20** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Беларуская часіна.
**19.55** Футбол. Ліга Еўропы. Базель - Фулхэм. Прамая трансляцыя.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы. Спарта - Капенгаген. Прамая трансляцыя.
**00.00** Серыял «На рагу ў Патрыяршых-4» (Расія). 2-я серыя.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!.
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** Прэм'ера. «Крызісы. Прадказанні Прарока». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Адкрыйце, міліцыя!».
**13.10** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**15.20** Тэлесерыял «Бухта Філіпа».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Тэлесерыял «Адкрыйце, міліцыя!».
**22.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі+».
**00.00** Прэм'ера. «Дом, у якім ён жыве. Уладзімір Землянікін». Дакументальны фільм.
**00.55** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.40** «Выратавальнікі».
**09.10** Вострасюжэтны серыял «Ліцейны».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.10** «Дачны адказ».
**12.10** «Алтар Перамогі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Ліцейны».
**21.50** Дэтэктыўны серыял «Адзін цень на дваіх».
**23.00** Сёння.
**23.25** «І зноў добры дзень!».
**00.15** «Першая кроў».

### EUROSPORT

**09.35** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**09.45** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**11.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**12.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**13.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**14.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**15.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. Гарахаў (Чэхія).
**16.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**18.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**19.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**19.30** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** «Прыгоды». ААЭ. Часопіс.
**20.40** Абранае па серадах.
**20.50** Абранае па серадах. Госць тыдня.
**21.00** Конны спорт. Спартоўцы топ-10. Брусэль (Бельгія).
**22.00** Конны спорт. Мастэрс. Брусэль (Бельгія).
**23.00** Конны спорт. Канкур. Лондан (Вялікабрытанія).
**00.15** Навіны коннага спорту.
**00.20** Ветразевы спорт. Кубак Амерыкі. Навіны.
**00.30** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**00.35** Яхт клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.40** Абранае па серадах.
**00.45** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**01.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. Гарахаў (Чэхія).

### БЕЛСАТ tv

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.10** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**19.40** «Крымская крыніца», дак. фільм, рэж. Яцэк Лэнскі, 2008 г., Польшча.
**20.30** Рэпартэр (публіцыстычна-інфармацыйная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Багі» (спазнаваўчая праграма).
**21.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**22.25** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**22.40** Аб'ектыў.

## 17 СНЕЖНЯ, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**06.45, 07.45** Зона X
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Зямельнае пытанне».
**09.05** Серыял «Блудныя дзеці» (Расія).
**09.55** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН «Напевы Гарадзенскага краю» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША - Вялікабрытанія).
**13.05** Дэтэктыўны серыял «Вероніка Марс-3» (ЗША).
**13.50** Уласнай персонай.
**14.15** Дакументальны фільм «Калі нараджаўся Новы свет...» (Максім Лужанін).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Людзі на мяжы. Жыццё ля сістэмы».
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Турэцкага» (Расія).
**16.45** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай» .
**18.50, 00.10** «Зона X». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Серыялерыял «Блудныя дзеці».
**21.00** Панарама.
**21.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.05** Драматычны вострасюжэтны серыял «Часткі цела» (ЗША).
**00.15** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Лапушкі». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**18.55** Прэм'ера. «Слова жанчыне». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Лапушкі». Шматсер. фільм.
**22.10** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Зімовая серыя гульняў.
**23.30** Нашы навіны.
**23.45** Навіны спорту.
**23.50** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.30** Нашы навіны.
**01.45** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** «Рэдакцыя». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.50** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Прыватныя гісторыі».
**14.40** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Правілы згону». Серыял. Закл.серыя.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** «Еўрапейскі канвой». Серыял.
**22.00** «Асабісты інтарэс».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Сакрэтныя гісторыі».
**23.55** «Рэдакцыя». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Дак.фільм «Не гульня ў пацеркі» (БТ).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Даенная драма «Чаклун і Румба».
**12.10** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**13.45** Экспедыцыя.
**14.10** Бітва экстрасэнсаў.
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.55** Пазакласная гадзіна.
**17.10** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Беларуская часіна.
**19.55** Футбол. Ліга Еўропы. Джэноа - Валенсія. Прамая трансляцыя.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы. Эвертан - БАТЭ. Прамая трансляцыя.
**00.00** Серыял «На рагу ў Патрыяршых-4» (Расія). 3-я серыя.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!.
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Кошт перамогі. Генерал Гарбатаў». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Адкрыйце, міліцыя!». Расія, 2008 г.
**13.10** «Гарадок». Дайджэст.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**15.20** Тэлесерыял «Бухта Філіпа».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Тэлесерыял «Адкрыйце, міліцыя!». Расія, 2008 г.
**22.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі+».
**00.00** Прэм'ера. «Далёкаўсходні выхад». Фільм 4-ы. «Выспа рускіх». Дак. фільм.
**01.00** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.40** «Барацьба за ўласнасць».
**09.10** Вострасюжэтны серыял «Ліцейны».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.10** «Жаночы погляд».
**12.00** «Прафесія рэпарцёр».
**12.30** «Першая кроў».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Ліцейны».
**21.50** Дэтэктыўны серыял «Адзін цень на дваіх».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Позняя гутарка».
**00.15** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** «Прыгоды». ААЭ. Часопіс.
**10.00** Ралі. «Мэта - Дакар». Часопіс.
**10.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Агляд сезону.
**11.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**12.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Паклюка (Славенія).
**14.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**15.15** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Паклюка (Славенія).
**17.00** Зімовыя віды спорту. Скачкі на лыжах з трампліна (Швейцарыя).
**17.15** Фігурнае катанне. Паказальны выступ. Інгольштат (Германія).
**18.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**19.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Паклюка (Славенія).
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Паклюка (Славенія).
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**00.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**01.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Паклюка (Славенія).

### БЕЛСАТ tv

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**19.35** YoLife! (моладзевая праграма).
**20.00** На колах.
**20.30** «Бульбаны», мультсерыял: «Пераднавагодняя клопаты», ч. 01.
**20.40** Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**22.20** Без рэтушы: «Амазонкі глыбокіх крыніц», рэпартаж, 2009 г., Беларусь.
**22.40** Аб'ектыў.

## 18 СНЕЖНЯ, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Вострасюжэтны серыял «Блудныя дзеці» (Расія)
**09.55** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША - Вялікабрытанія).
**13.10** Дэтэктыўны серыял «Вероніка Марс-3» (ЗША).
**14.05** «Шпілька». Праграма для жанчын.
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Царства зубра» цыклу «Нацыянальныя паркі Беларусі»
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Турэцкага» (Расія).
**16.45** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.55** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія)
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Блудныя дзеці» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Вострасюжэтны серыял «Блудныя дзеці» (Расія). Заключная серыя.
**23.00** Драма «Шырока заплюшчанымі вачыма» (ЗША- Вялікабрытанія).
**01.45** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсерыйны фільм.
**10.00** «Лапушкі». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** АНТ прадстаўляе: «Зваротны адлік».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера АНТ: «Музычны суд».
**22.40** «Хвіліна славы».
**00.25** Наша «Беларашa».
**01.00** Нашы навіны.
**01.15** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Рэдакцыя». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.50** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Еўрапейскі канвой». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтарэс».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «КВЗ. Першая ліга. Фінал».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.15** Фільм «Раптоўны ўдар». ЗША-Канада, 2000 г.
**01.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Дак.фільм «Разам з ім» (Беларускае тэлебачанне»).
**08.35** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Жансавет.
**10.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.00** Лірычная кінааповесць «Дзённік дырэктара школы» (СССР).
**12.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**13.15** «Іншыя».
**13.45** Жывы гук.
**14.25** Мультсерыял «Аладзін» (ЗША). 4-я серыя.
**14.50** «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс для дзяцей (Расія).
**15.00** Свая музыка. Працяг.
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія-Швейцарыя).
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Гараджане.
**19.40** Пра мастацтва.
**20.10** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**21.10** Калыханка.
**21.30** Бітва экстрасэнсаў.
**22.40** Час футболу.
**23.10** Футбол. Ліга Еўропы. Агляд тура.
**00.05** Тэлепорт.
**00.30** Баскетбол. Кубак Беларусі. Фінал.

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!.
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Адкрыйце, міліцыя!». Расія, 2008 г.
**13.10** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Пакой смеху».
**15.20** Тэлесерыял «Бухта Філіпа».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.55** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Прэм'ера. «Крывое люстэрка».
**22.45** Навіны - Беларусь.
**22.55** Фільм «Без віны вінаватыя». Расія, 2008 г.

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.35** «Кухары і кухцікі».
**09.05** «Масква - Ялта - Транзіт».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.15** «Вочная стаўка».
**12.05** «І зноў добры дзень!».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі...».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Прэм'ера. «Зараза. Вораг унутры нас».
**22.15** Прэм'ера. Псіхалагічны трылер «Шпік».
**00.00** Іранічная камедыя «Ва ўсёй красе».

EUROSPORT

**09.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Паклюка (Славенія).
**10.45** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Паклюка (Славенія).
**12.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Хуткасны спуск/камбінацыя. Валь д'Ізэр (Францыя).
**13.00** Футбол. Лёсаванне Лігі чэмпіёнаў УЕФА.
**13.45** Футбол. Госць тыдня. Часопіс.
**14.00** Футбол. Лёсаванне Лігі Еўропы.
**14.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Хуткасны спуск/камбінацыя. Валь д'Ізэр (Францыя).
**15.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам/камбінацыя. Валь д'Ізэр (Францыя).
**15.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыя. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).
**16.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Супер-гігант. (Італія).
**17.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Паклюка (Славенія).
**18.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Паклюка (Славенія).
**19.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыя. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам/камбінацыя. Валь д'Ізэр (Францыя).
**21.00** Самыя моцныя людзі планеты. Гран-пры суперсерый. Румынія.
**22.00** Боўлінг. PBA тур. ЗША. Часопіс.
**23.00** Конны спорт. Канкур. The Christmas Puissance. Лондан (Вялікабрытанія).
**00.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**00.10** Покер. Турнір Partouche (Францыя).
**01.10** Ралі. «Мэта - Дакар». Часопіс.
**01.25** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**01.40** Экстрэмальныя віды спорту. Часопіс.
**02.10** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**02.20** Вось дык так!!!

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.15** «Абліччa смерці», дак. фільм, 2005 г., Германія–Расія.
**20.05** Невядомая Беларусь: «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь, ч. 02.
**20.35** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Happy New York», маст. фільм, 1997 г., Польшча.
**22.50** Аб'ектыў.

## 19 СНЕЖНЯ, СУБОТА

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Афрыка. Магічны кантынент» (Францыя)
**07.15** Існасць
**07.45** Дзень спорту
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны
**09.05** Здароўе
**09.40** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**10.30** «Шпілька». Праграма для жанчын
**11.05** Ранішняя хваля
**11.45** «OFF STAGE LIFE»
**12.10** Народная камедыя «Белыя Росы» («Беларусьфільм»)
**13.55** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь)
**14.20** Алімпійскі часопіс
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Вакол планеты»
**16.10** Відэафільм АТН «Прабач мяне»
**16.35** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**17.35** Відэафільм АТН «Пружанскі «Палаццо» Вялікакняжацкай кароны» цыклу «Зямля беларуская»
**17.55** «Ваша лато»
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка»
**19.20** «Зорныя танцы». «Жаночы сезон»
**21.00** Панарама
**21.40** Рамантычная драма «Каханне падчас халеры» (ЗША)
**00.20** «Уласнай персонай»

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** Асяроддзе пасялення. «Фастфуд».
**11.30** «Мой радавод».
**12.25** АНТ прадстаўляе: Тэлечасопіс «Саюз».
**12.55** Суботні «Ералаш».
**13.15** Камедыя «Лысы нянька: Спецзаданне». ЗША-Канада, 2005 год.
**15.00** Прэм'ера АНТ: «Эфект Мірнага».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Тэорыя неверагоднасці. «Вялікія вар'яты».
**17.05** АНТ прадстаўляе: «Рэкламная паўза».
**18.00** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**19.00** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**19.35** «Ледніковы перыяд».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ледніковы перыяд». Працяг.
**23.40** «Пражэктарпэрысхілтан».
**00.15-01.40** «Што? Дзе? Калі?». Фінал.

**07.05** «Агенцтва». Камедыйны серыял.
**07.30** Фільм «Па сакрэце ўсяму свету». СССР, 1976г.
**09.30** «Культурнае жыццё».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.05** «Ваенная таямніца».
**15.00** Фільм «Безназоўная зорка». СССР, 1978г. 1-я серыя.
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.20** «Top Gear. Руская версія».
**18.10** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** СТВ прадстаўляе: «З чаго пачынаецца Радзіма».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Малая на мільён». ЗША, 2004г.
**00.00** Фільм «Вялікі белы клопат». Германія-ЗША-Канада, 2005г.
**01.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**02.30** «Сімпсаны». Мультсерыял.

**07.45** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.10** Усё аб бяспецы.
**08.40** Гараджане.
**09.10** Тэлепорт.
**09.40** Нашы тэсты.
**10.15** Жансавет.
**10.55** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**12.20** Свая кампанія.
**13.05** «Лабірынты гісторыі беларускіх яўрэяў». Частка другая.
**13.30** «Запал па культуры».
**14.10** Фантастычны серыял «Эўрыка» (ЗША).
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Манчэстэр Сіці - Сандэрленд. Прамая трансляцыя.
**19.00** «Зоркі гумару». Гумарыстычная праграма (Расія).
**20.45** Псіхалагічная драма «Замова» (Расія).
**22.30** Жывы гук.
**23.15** Казанова.

РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.10** «Крывое люстэрка».
**09.00** «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
**09.35** Фільм «Без віны вінаватыя». Расія, 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** Фільм «Без віны вінаватыя». Расія, 2008 г. Працяг.
**12.25** Фільм «Перад світанкам».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Іншыя берагі Анастасіі Вярцінскай». Дакументальны фільм.
**15.15** Фільм «Безназоўная зорка». 1-я серыя.
**16.35** «Пакой смеху».
**17.00** «Новая хваля - 2009».
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** «Гарадок».
**20.15** Фільм «Улетку я аддаю перавагу вяселлю». Расія, 2009 г.
**22.15** Юбілейны вечар М.Жванецкага.
**01.10** Заканчэнне эфіру.

НТВ

**06.05** Псіхалагічны трылер «Шпік».
**07.35** «Казкі Бажэнава».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Агляд».
**09.20** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.15** Прэм'ера. Прыгодніцкая камедыя «Выспа Нім».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вярнуць на даследаванне».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.15** «Руская сенсацыя».
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.15** «Пара Піначчэтаў». Спецвыпуск.
**00.00** Крымінальная драма «Маленькія рыбкі».

EUROSPORT

**09.30** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**09.40** Санкавы спорт. Кубак свету. Ліллехамер (Нарвегія).
**10.10** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыя. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).
**11.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт. Паклюка (Славенія).
**12.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Хуткасны спуск. Валь д'Ізэр (Францыя).
**13.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Хуткасны спуск (Італія).
**14.30** Зімовыя віды спорту. Скачкі на лыжах з трампліна (Швейцарыя).
**14.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).
**16.30** Лыжнае двухборства. Кубак свету. Гонка па сістэме Гундэрсена. Рамзаў (Аўстрыя).
**17.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Спрынт. Паклюка (Славенія).
**18.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны/жанчыны. Спрынт класічным стылем. Рогла (Славенія).
**19.25** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**19.35** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).
**21.00** Вось дык так!!!
**21.30** Вось дык так!!!
**22.00** Бокс. Сэн-Наззр (Францыя).
**00.00** Конны спорт. Канкур. The Santa Stakes. Лондан (Вялікабрытанія).
**01.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.10** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.20** Героі не нашага часу: Зінаіда Бандарэнка. Права на несупадзенне.
**19.35** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**20.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Спадар забойства», маст. фільм, 1998 г., ЗША. 2 серыя.
**22.40** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 20 СНЕЖНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**07.45** Фільм-казка «Залатыя рогі» (СССР)
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны
**09.05** Арсенал
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь)
**09.50** Альманах вандраванняў
**10.15** Культурныя людзі
**10.55** «У свеце матораў»
**11.30** «Nota Bene»
**12.10** Дэтэктыў «Мёртвы сезон» (СССР). 1-я і 2-я серыі



**14.45** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь)
**15.10** Навіны рэгіёна.Гародня
**15.30** Відэафільм «Планета гольфа: ААЭ»
**15.55** Фантастычная камедыя «Мой любімы марсіянін» (ЗША)
**17.40** Алімпійскі часопіс
**18.00** Суперлата
**19.15** «OFF STAGE LIFE».
**19.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў
**21.00** «У цэнтры ўвагі»
**22.10** «Зорныя танцы». «Жаночы сезон»
**23.40** Канцэрт, прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння кампазітара Яўгенія Глебава.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** Мультфільм.
**13.20** Прэм'ера. «Анастасія Вярцінская. Што бяжыць па хвалях».
**14.20** Фільм «Пунсовыя ветразі».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Нядзельны «Ералаш».
**16.40** «Машына часу» - 40 гадоў». Юбілейны канцэрт.
**18.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** «Вялікая розніца».
**22.45** «Здабытак Рэспублікі».

**06.40** «Агенцтва». Камедыйны серыял.
**07.10** Фільм «Дом, які пабудаваў Свіфт». СССР, 1983 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.30** «Добры дзень, доктар!».
**14.00** «Прыватныя гісторыі».
**15.00** Фільм «Безназоўная зорка». СССР, 1978г. 2-я серыя.
**16.15** «Рэальны спорт».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Дабранач і поспехаў». ЗША-Францыя-Японія, 2005г.
**22.30** «Прафесійны бокс».
**23.30** Фільм «Пацалунак». Бельгія, 2004г.
**01.10** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**01.55** «Сімпсаны». Мультсерыял. Заключныя серыі.

**07.20** Дабравест.
**07.45** Мір вашай хаце.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Псіхалагічная драма «Замова» (Расія).
**09.55** Школа рамонту.
**10.55** Медычныя таямніцы.
**11.40** Кінаспробы.
**12.00** Бухта капітанаў.
**12.40** «Правы чалавека».
**12.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**13.40** Гаспадар.
**14.10** Фантастычны серыял «Эўрыка» (ЗША).
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.00** Прэм'ера. Серыял «Несамотныя» (Расія-Украіна). 1-4 серыі.
**19.30** Нашы тэсты.
**20.10** Экспедыцыя.
**20.45** Тэлебарометр.
**21.05** Дэтэктыўны трылер «Сакрэты Лос-Анджэлеса» (ЗША).
**23.35** Свая музыка. Працяг.
**00.05** Пасоўванне+.

**РОССИЯ**

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.30** Мультфільм.
**07.35** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**08.05** Юбілейны вечар М.Жванецкага.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Фільм «Сяброўкі».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**15.00** Фільм «Безназоўная зорка». 2-я серыя.
**16.20** «Хай абыйдуць цябе лавіны...». Юры Візбар.
**17.50** Прэм'ера. «Аншлаг і Кампанія».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў».
**20.40** Прэм'ера. «Лепшыя гады нашага жыцця».
**22.40** «Адмысловы карэспандэнт».
**23.50** Фільм «Так бывае». Расія, 2007 г.
**01.30** Заканчэнне эфіру.

**НТВ**

**06.15** Прыгодніцкая камедыя «Выспа Нім».
**07.50** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Барацьба за ўласнасць».
**11.20** «Асабліва небяспечны!».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Савецкія біяграфіі».
**14.25** Камедыя «Асаблівасці нацыянальнага палявання ў зімовы перыяд».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вярнуць на дследаванне».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** Прэм'ера. «Нтвшнікі». Сталін з намі!
**22.00** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «З жыцця капітана Чарняева».

**EUROSPORT**

**09.35** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Спрынт. Паклюка (Славенія).
**10.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам-гігант (Італія). Спроба 01.
**11.35** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Супер-гігант. Валь д'Ізэр (Францыя).
**13.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Паклюка (Славенія).
**13.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам-гігант (Італія). Спроба 02.
**14.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).
**16.30** Лыжнае дваяборства. Кубак свету. Гонка па сістэме Гундэрсена. Рамзау (Аўстрыя).
**17.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу. Паклюка (Славенія).
**18.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 15 км класічным стылем. Рогла (Славенія).
**19.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).
**20.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Паклюка (Славенія).
**20.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Тэлфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**22.00** Конны спорт. Канкур. Olympia International. Лондан (Вялікабрытанія).
**23.00** Конны спорт. Канкур. The Ivy Stakes. Лондан (Вялікабрытанія).
**00.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Паклюка (Славенія).
**01.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу. Паклюка (Славенія).
**01.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**19.00** «Аблавушак», мультсерыял
**19.15** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**19.30** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 9 серыя
**20.15** Форум (ток-шоу): «Беспрацоўе: хто вінаваты?»
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.25** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21.50** Фільматэка майстроў: «Мачука, маст. фільм, рэж. Андрэс Вуд, 2004 г., Чылі–Іспанія.

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012211080010 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926
г. Минск, ул. Коллекторная, 11

КУДА ______
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Кассир

Пеня ______
Всего ______


# Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА




# РУСКІ ПРАВАПІС СУПРАЦЬ ПАЛІТЫКІ

Іван БІЧ

**Заклік беларускіх уладаў называць нашу краіну не «Белоруссия», а «Беларусь» выклікаў у суседняй Расіі цікавую грамадскую дыскусію.**

Думаецца, што ўся праблема ў тым, што ў суседзяў ініцыятыву Мінска разглядаюць у кантэксце лінгвістычнай вайны Кіева і Масквы. Для ўкраінцаў крыўдна чуць, калі кажуць «на Украіну», а не «ва Украіну». Для суайчыннікаў братоў Клічко першы варыянт утрымлівае падтэкст, што Украіна — гэта ўскраіна, а не асобная дзяржава. Аднак акадэмічныя ўстановы Расіі ўпарта адмаўляюцца карэктаваць прыназоўнік.

Даведачная служба рускай мовы зноў і зноў паведамляе, што паводле правіл рускай мовы можна казаць толькі «на Украіне». Суверэннасць іншай дзяржавы, як кажуць расійскія філолагі, не можа ўплываць на граматыку якой-небудзь мовы.

У сваю чаргу, афіцыйны Кіеў запатрабаваў ад сваіх чыноўнікаў і дыпламатаў у афіцыйнай перапісцы ўжываць выключна «в Украину». Ёсць шматлікія прыклады, калі расійскіх вучоных, якія чытаюць лекцыі ва Украіне, прасілі ўжываць прыназоўнік «в», каб не правакаваць аўдыторыю.

Тая ж гісторыя з Малдовай (рускі варыянт «Молдавия»), Кыргызстанам (рускі варыянт «Киргизия») і г.д. Нічога дзіўнага, што ў згаданым патрабаванні беларусаў шмат хто адчуў элемент небяспекі.

Раней расійскія філолагі казалі, што ніякай «Беларусі» ў рускай мове няма. Пераход на «Беларусь» насуперак правілам значыць, што тыя правілы — не такая ўжо сакральная рэч.

Аднак адна справа — адмаўляць «аранжавым», а іншая — адзінаму, магчыма, геапалітычнаму саюзніку. Таму дзяржаўныя службоўцы, якіх прасілі пракаментаваць праблему, фактычна сыходзілі ад адказу.

Дырэктар Інстытута лінгвістыкі Максім Кронгаўз у расійскай газеце «Взгляд» прызнае, што праблема «Беларусь» або «Белоруссия» і «на Украину» або «в Украину» — з'явы аднаго і таго ж парадку.

Далей Кронгаўз дае туманныя і не надта зразумелыя парады: «На мой погляд, мы павінны сыходзіць з рускай традыцыі, але калі беларускія службоўцы патрабуюць казаць па-іншаму, сітуацыя набывае іншую плоскасць. Палітыкі павінны прыняць сваё рашэнне, а ўсім жа людзям пры выкарыстанні гэтага слова варта кіравацца традыцыямі рускай мовы, а калі яны знаходзяцца ў сітуацыі ціску — дзейнічаць па сітуацыі».




Затое далёкія ад геапалітычнай кан'юнктуры расіяне рэжуць праўду-матку ў лоб. Для іх адмовіцца ад ужывання «Белоруссия» тое ж самае, што страціць частку нацыянальнай рускай годнасці.

Блогер Est Deus піша: «Яшчэ чаго? А «Песнярам», значыць, трэба забараніць спяваць песню «Молодость моя Белоруссия»? І тады яшчэ чарга ўзнікне. Улады Вялікабрытаніі, напрыклад, затрабуюць, каб у нас называлі іх краіну Грэйт Брытан. А ўжо чаго японцы запатрабуюць, нават уявіць страшна».

«Па-першае, выкажу здзіўленне, што назва «Белоруссия» — крыўдная. Як быццам рускія тут выкарыстоўваюць непрыстойны выраз. Што тут непрыстойнага, і якая розніца для беларусаў — «Белоруссия» ці «Беларусь»? Першая назва для рускіх звыклая, звязаная менавіта з Беларусіяй як дзяржавай (рэспублікай), а другое — выклікае асацыяцыі, прашу прабачэння, не з дзяржавай, а з трактарам «Беларусь», які тут у нас шырока выкарыстоўваўся. Вось калі б гэты беларускі таварыш быў бы больш паслядоўным, ён бы наадварот павінен быў крыўдзіцца, калі б мы называлі яго краіну, як трактар. Яшчэ раз прашу прабачэння — не я прыдумаў гэтую праблему», — піша нехта Яфімачкін на сваім блогу.

Яшчэ адзін рускі патрыёт, Прохаў, так тлумачыць сваю пазіцыю: «Тытул цара Аляксея Міхайлавіча быў дапоўнены і стаў выглядаць так: «Самодержец всея Великия і Малыя і Белыя Русі». Гэта значыць, існавалі Вялікая, Малая і Белая Русь… Назва «Белоруссия» паўстала як нацыянальная саманазва, прынятая ідэолагамі беларускага так званага нацыянальна-вызваленчага руху толькі напрыканцы XIX стагоддзя. Гэта значыць, што ўпершыню «Белоруссия» ўзнікае на глебе сепаратысцкіх памкненняў у нетрах самога беларускага народа (украінскі сепаратызм канца XIX стагоддзя — з назвай «Украіна» замест «Малороссия»). Таму назва «Беларусь» (ад Белая Русь) гістарычна больш старажытная, этымалагічна правільная. «Белоруссия» (Бела-Руссия) з'явілася як проціпастаўленне «імперскім», «царскім», «маскальскім» назвам Белай Русі на пачатку нараджэння беларускага нацыяналізму. Гэтая ж назва была з радасцю падхоплена бальшавікамі (таксама як і «Украіна» замест «Малороссия»)».

Нельга не згадаць артыкул на сайце Фергана.ру (папулярны рускамоўны цэнтральнаазіяцкі інтэрнэт-рэсурс). Яго супрацоўнікі катэгарычна супраць назвы «Беларусь». Яны бачаць тут небяспечны прэцэдэнт, у выніку якога ўлады рэгіёна могуць прымусіць іх ужываць новыя непапулярныя сярод рускамоўных тапаграфічныя назвы, якія з'явіліся тут пасля развалу Савецкага Саюза.

Фергана.ру: «Не трэба бачыць у тым, як мы пішам назву былой сталіцы Казахстана, прайву рускага нацыяналізму ці непавагу да казахскага суверэнітэту. Гэта не палітыка, гэта ўсяго толькі лінгвістыка. Пытанне правільнага ці няправільнага рускага напісання геаграфічных назваў на постсавецкай прасторы нельга тлумачыць як пытанне: «Ты мяне паважаеш?». І надышоў час перастаць успрымаць тэксты, напісаныя на рускай мове ў расійскіх сродках масавай інфармацыі, за дырэктывы. Так, мы пішам Алма-Ата. А вы ў сябе ў Казахстане пішыце Алматы. І ніхто нікога не вучыць. Галоўнае, што мы ўсе разумеем, пра які горад ідзе гаворка. Пакуль разумеем… Мы далёкія ад пафасу на тэму «вялікай рускай мовы». Мы — не падручнік рускай мовы, не энцыклапедыя класічных літаратурна-мастацкіх тэкстаў і не акадэмічны слоўнік. Мы — жывы сродак масавай інфармацыі».

Варта сказаць, што ў Расіі ёсць і тыя, хто гатовы прызнаць за беларусамі права называць сваю краіну так, як яны хочуць: «Лічу, што самая вялікая шкода справе аднаўлення раней створанага адзінства прыносіць напышлівае стаўленне расіян да цяперашніх беларусаў (дый да ўкраінцаў таксама). Дастаткова наведаць беларускія і ўкраінскія форумы, каб заўважыць, што нават лаяльныя да Расіі беларусы і ўкраінцы адчуваюць сябе абражанымі такім стаўленнем. Дык давайце ж пачнём паважаць суседзяў. Спачатку трэба павагу заслужыць, а потым ужо і пра саюз размаўляць.

Самае парадаксальнае, што ўся абарона назвы «Белоруссия», якая разгарнулася ў рунэце, не мае ніякай перспектывы. Адзін з карыстальнікаў згадвае: «У свой час Персія папрасіла зваць яе Іранам, Бераг Слановай Косткі — Кот-д'Івуар, Цэйлон — Шры-Ланкай, Бірма — М'янмай, Паўночная Радэзія — Замбіяй, Бенгалія — Бангладэш, Верхняя Вольта — Буркіна-Фасо… Менавіта пад новымі назвамі гэтыя краіны вядомыя сёння ва ўсім свеце. З падобнай «просьбай» да сусветнай супольнасці звярнуліся і беларусы… Такім чынам, БССР (Белоруссия) спачыла, як калісьці Персія, Цэйлон ці Радэзія. Яе ж правапераемнікам стала Рэспубліка Беларусь (Беларусь). Арфаграфія і моўная традыцыя тут не пры чым».

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Хацеў бы вам паведаміць, што на момант майго візіту ў Мінск рашэнне пра дзяржаўны візіт прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі прынятае не было. А парадак дня яшчэ не сфармаваны. Размова з прэзідэнтам аказалася вельмі шчырай. Дастаткова не простай, вельмі эмацыйнай. Магу сказаць, што Лукашэнка зрабіў на мяне моцнае ўражанне. Яго тэлевізійны вобраз, які ўжо сфармаваны, далёкі ад рэальнасці.

**Фрагмент інтэрв'ю міністра замежных спраў Украіны Пятра Парашэнкі газеце «Зеркало недели» (Украіна)**

Масква хоча атрымаць магчымасць удзельнічаць у прыватызацыі беларускіх нафтахімічных прадпрыемстваў. Да гэтага часу Аляксандр Лукашэнка спрабаваў не дапускаць расійскі і ўвогуле любы іншы замежны капітал да ўдзелу ў беларускай прыватызацыі. Ён наогул імкнецца праводзіць прыватызацыю так, каб яна насіла адкрыта касметычны характар. У прыватнасці, нядаўна МВФ запатрабаваў у яго выставіць на продаж пяць прадпрыемстваў. У выніку тыя прадпрыемствы, якія выставіў Лукашэнка, аказаліся нецікавыя для замежных інвестараў, і, магчыма, пакупнікоў на іх увогуле не будзе. Лукашэнка цалкам зацікаўлены ў тым, каб захаваць у Беларусі адміністратыўна-камандную эканоміку і звесці працэсы прыватызацыі да мінімуму.

**REGNUM (Расія)**

Прэзідэнт Беларусі зноў перапусаваў склад сваёй вертыкалі ўлады, але практычна не змяніў яе твар. Адны службоўцы рыхтуюцца да пераезду ў іншыя будынкі, іншыя змяняць толькі кабінеты і таблічкі на іх дзвярах. Ёсць не вельмі вядомыя публічныя імёны, але няма свежай крыві. Эксперты дружна адмаўляюцца бачыць у сённяшніх перастаноўках якую-небудзь знакавасць.

**«Московский комсомолец» (Расія)**

Калі разглядаць асяроддзе Віктара Лукашэнкі як некаторую палітычную групу з уласнымі амбіцыямі, то можна сказаць пра яе ўзмацненне ў выніку праведзеных зменаў чыноўнікаў. Упершыню гэтыя людзі паспрабавалі распаўсюдзіць свой уплыў за межы сілавога блока.

**«Известия» (Расія)**

Больш за ўсё шуму ў Мінску выклікала прызначэнне былога галоўнага ідэолага краіны Алега Праляскоўскага міністрам інфармацыі. Спадар Праляскоўскі, які кіраваў інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі прэзідэнта, а яшчэ раней узначальваў аддзел у службе бяспекі прэзідэнта, лічыцца найбольш актыўным прыхільнікам "закручвання гаек" у адносінах з недзяржаўнымі СМІ.

**«Коммерсантъ» (Расія)**

Перадзэдзены Сільвія Берлусконі архіўныя дакументы (пра лёс італьянскіх салдат, якія змагаліся на баку Германіі падчас другой сусветнай вайны ў Беларусі) можна лічыць сапраўдным калядным падарункам першаму лідэру заходняга ўраду, што прыпыніў свain візітам ізаляцыю прэзідэнта Беларусі, якога менш усяго жадалі б бачыць сваім госцем дэмакратычныя краіны.

**«La Repubblica» (Італія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ПОЛЬШЧА. ТРЫБУНА ПРЫПЫНЯЕ ВЫХАД


STOŁECZNA Trybuna
CZWARTEK, 10 IV 2008
Walka o miejsce na sortownię
Ekon wciąż swoje
Wczoraj przed ratuszem Ekon zorganizował sortownię odpadów. Dziesiątki pracowników, tzw. ekomrówek, chciało pokazać warszawiakom swoją działalność, a jednocześnie upomnieć się o umowę dzierżawy terenu.

Уладальнік выдавецкай групы «As Novum» Аркадзіуш Астроўскі паведаміў пра прыпыненне выхаду газеты «Trybuna». «Trybuna» была нашчадкам славутай газеты «Trybuna Ludu» — органу Польскай аб'яднанай рабочай партыі. «Trybuna Ludu» была заснавана ў 1948 годзе. За савецкім часам наклад газеты складаў часам 500 тысяч асобнікаў. Пасля дэмакратычных рэформ пачатку 1990-х гадоў група былых камуністаў, аб'яднаных у Саюз левых дэмакратаў (SLD), паспрабавала надаць былому галоўнаму афіцыёзнаму выданню новы імідж. «Trybuna» — так стала называцца «Trybuna Ludu» — паспрабавала заняць нішу агульнага выдання польскай новай левай. Пры газеце нават выходзіў дадатак, які рабілі антыглабалісты.

Аднак праект праваліўся. Новае пакаленне польскіх левых, асабліва моладзь, адмаўляецца лічыць партыю SLD і яе медыйны праект ідэйна блізкімі. Таму газету чытаюць галоўным чынам пенсіянеры і тыя, хто мае настальгію па часам камунізму. Адсюль фінансавыя праблемы ў рэдакцыі. Ёй цяжка знайсці рэкламу. Менавіта фінансавае пытанне, па словах выдаўца, давяло газету да банкруцтва. Праўда, Астроўскі заявіў, што працягне пошук новых спонсараў выдання.

**Па матэрыялах «Lewica» (Польшча)**

### УКРАІНА. ЦІМАШЭНКА ЗБІРАЕЦЦА АДРЭЗАЦЬ КАСУ

Нагадаем, што каса — галоўная частка іміджу Юліі Цімашэнка з часоў «аранжавай рэвалюцыі». І вось цяпер славутай касы, пра якую хадзілі анекдоты, якая была прадметам палітычных спекуляцый (праціўнікі Юліі нават сцвярджалі, што каса штучная), не стане. Цімашэнка плануе змяніць імідж у новым годзе. Па словах яе цырульніцы Алены Сівых, змена знешняга выгляду прэм'ера адбудзецца паступова.

Навіна пра касу выклікала шквал выказванняў з боку лепшых цырульнікаў краіны. Усе яны актыўна разважаюць, які тып прычоскі пасаваў бы палітку. «Думаю, ёй (Цімашэнка) падышла б класічная прычоска сярэдняй даўжыні па тэхналогіі Undercut, калі ніжні перыметр крыху карацей за верхні. Класіка — гэта цяпер галоўная тэндэнцыя», — лічыць стыліст Руслана Мароз, дачка экс-спікера Аляксандра Мароза. Простыя цырульнікі, якія не працуюць з кліентамі з палітычнай эліты, больш банальна каментуюць ідэю прэм'ера. На іх думку, праблема ў стане валасоў Юліі Цімашэнка. «Немагчыма насіць пяць гадоў запар касу без шкоды для валасоў», — кажа адзін з іх.

**Па матэрыялах «Сегодня» (Украіна)**

### ФРАНЦЫЯ. САРКАЗІ ПАДТРЫМАЎ ЗАБАРОНУ МІНАРЭТАЎ



Нікаля Сарказі, прэзідэнт Францыі, выступіў з заявай, якая супярэчыць пазіцыі большасці краін-сябраў Еўрапейскага саюза, што тычыцца скандальнага рэферэндуму ў Швейцарыі. Нагадаем, што два тыдні таму швейцарцы шляхам усеагульнага галасавання вырашылі забараніць будаўніцтва ў краіне мінарэтаў. Рэакцыя лідэраў і ўрадаў вядучых дзяржаў Еўропы, уключаючы нават Ватыкан, была даволі негатыўнай. На іх думку, такі падыход супярэчыць закону пра свабоду веравызнання.

А вось Сарказі лічыць інакш. «Замест таго, каб атакаваць швейцарскі народ, мы павінны спачатку зразумець, што хацелі сказаць швейцарцы і чаму тое ж адчуваюць многія народы Еўропы, у тым ліку французы», — піша прэзідэнт у артыкуле, які змясціла выданне «Le Monde». Сарказі таксама лічыць, што крытыка швейцарскага выбару падрывае права народа прымаць калектыўныя рашэнні. Увогуле, на яго думку, вынікі рэферэндуму падкрэсліваюць, як неабходныя Францыі дэбаты пра нацыянальную ідэнтычнасць.

Нагадаем, што такія дэбаты стартавалі ў краіне прыкладна месяц таму, аднак дасюль яны галоўным чынам цікавілі правыя экстрэмісцкія партыя. Намер Сарказі неяк ажывіць іх за кошт праекцыі на працэсы ў Швейцарыі быў ушчэнт раскрытыкаваны з боку палітолагаў. Навіна пра забарону будаўніцтва мінарэтаў у Швейцарыі і так ускалыхнула Францыю, дзе пражываюць 5 мільёнаў мусульман. І прывяла да падзелу грамадства: сёння палова насельніцтва выступае за прынясце падобнага закону ў Францыі.

**Па матэрыялах «Le Monde» (Францыя)**

▸ **ВЫБАРЫ**

# АСЦЯРОЖНАЕ АДКРУЧВАННЕ ГАЕК

**27 снежня ва Узбекістане пройдуць парламенцкія выбары, якія, як сцвярджаюць палітолагі, будуць мець выключна важнае значэння для будучыні краіны. Пра гэта журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з вядучым украінскім экспертам Цэнтра даследаванняў грамадскай супольнасці, спецыялістам па Узбекістану Віталем Кулікам.**



***— У восень мы сталі сведкамі неадназначнай падзеі. Еўрапейскі саюз нечакана адмяніў візавыя санкцыі супраць узбекскіх чыноўнікаў, што былі ўведзены пасля падаўлення паўстання ў Андзіжане.***

— Перш за ўсё трэба згадаць, што візавымі санкцыямі Еўропа тады не абмежавалася. Таксама было ўведзена эмбарга на продаж Узбекістану зброі. Аднак рашэнне еўрапейцаў — не саступка. Узбекістан дазволіў рэжым празрыстасці турэмнай сістэмы, дапусціў туды назіральнікаў. Менавіта сітуацыя ў турмах была ў цэнтры крытыкі з боку заходніх праваабаронцаў. Адменена смяротнае пакаранне. Палепшылася сітуацыя са сродкамі масавай інфармацыі. Незалежная прэса час ад часу нават крытыкуе чыноўнікаў і ўрад. Натуральна, чапаць Карымава забаронена. Увогуле, можна меркаваць, што адбываецца асцярожнае адкручванне гаек.

Кажучы пра падставы пацяплення адносін паміж Захадам і рэжымам Карымава, трэба адзначыць яшчэ адзін момант — кампактную групу узбекаў, якая жыве ва Афганістане і з'яўляецца адным з важных чыннікаў у стабілізацыі ў краіне. Ташкент мае рычагі ўплыву на афганскіх узбекаў. Вашынгтону, які хацеў бы пакончыць з талібамі, даводзіцца ўлічваць узбекскі фактар і намагацца падтрымліваць з Карымавым як мінімум фармальна добрыя адносіны.

***— Наколькі было звязана пацяпленне адносінаў Захаду з Узбекістанам з відавочна антымаскоўскімі выхадкамі Карымава — напрыклад, з сабатажам працэсу будаўніцтва АДКБ?***

— Тарпедаванне АДКБ — гэта хутчэй адмова ад мадэлі вертыкальнай вайсковай інтэграцыі пад кантролем Масквы і галоўнага канкурэнта Ташкента — Астаны. Узбекістан не праяўляе вялікай цікавасці да схемы інтэграцыі, дзе першую скрыпку грае Астана. Аднак гэта не значыць, што Узбекістан робіць стаўку на Захад. Карымаў у кожнай канкрэтнай сітуацыі абірае розных партнёраў — Еўрапейскі саюз, ЗША і Украіну, якая хацела б выконваць ролю галоўнага праваднік узбекскіх інтарэсаў у Еўропе.

***— Нядаўна прайшла інфармацыя пра тое, што Узбекістан нечакана зачыніў мяжу з Казахстанам. Гэта таксама частка гульні Карымава?***

— У гэтым выпадку — не. Справа ў тым, што цэнтральнаазіяцкія кардоны зачыняюць і адчыняюць увесь час. Так, Ташкент рэгулярна зачыняе мяжу з Кіргізіяй, якая дае палітычны прытулак узбекскай апазіцыі. Краіны — суседкі Узбекістана таксама практыкуюць такую меру. Яны вельмі баяцца акцый сепаратызму з боку ўзбекаў, якія жывуць асобным групамі літаральна ва ўсіх краінах, з якімі мяжуе Узбекістан. Адсюль не толькі зачыненне кардонаў, аднак таксама моўная і культурная дыскрымінацыя. У якасці прыкладу згадаем нядаўна прыняты закон аб мовах у Таджыкістане, які дэ-факта забараняе адукацыю на ўзбекскай мове, яе выкарыстанне ў дзяржаўных установах.

***— Сістэма «кантраляванай дэмакратыі» ва Узбекістане вельмі не падобная да мадэляў іншых аўтарытарных краін былога СССР. Знешне больш за ўсё яна нагадвае казахскую і расійскую — шматпартыйная сістэма, парламент абіраецца па спісах. Аднак, у адрозненні ад Расіі і Казахстана, ва Узбекістане праўладная партыя не такая моцная. З чым гэта звязана?***

— Сапраўды, прапрэзідэнцкая Ліберальна-дэмакратычная партыя заўсёды перамагае, аднак пры гэтым партыі сістэмнай апазіцыі таксама рэгулярна трапляюць у парламент. Справа ў тым, што тут слаба развітая палітычная культура. Лібералізм, сацыялдэмакратызм іншыя «ізмы», якія напісаны на сцягах праўладных і апазіцыйных партый, — гэта фікцыя. За кожнай партыяй стаіць асобны клан (увогуле, у краіне іх пяць). Карымаўская мадэль стабільнасці трымаецца на балансе паміж групоўкамі. Таму кожная партыя, колькі б галасоў яна ў рэальнасці ні набрала, усё роўна будзе мець дэпутацкую групу.

***— Якая сітуацыя ў краіне з апазіцыяй?***

— Існуюць тры больш-менш рэальныя апазіцыйныя аб'яднанні — партыя Ерк, «Бірлік» і «Азод Дэхканлар». Аднак іх уплыў на соцыум вельмі слабы. Калі б сёння праходзілі свабодныя выбары, яны б разам мелі некалькі працэнтаў галасоў. Адносна трывалую падтрымку апазіцыянеры маюць хіба што ў Ферганскай даліне. Такая сітуацыя можа тлумачыцца як знешнімі, так і ўнутранымі фактарамі. Натуральна, Карымаў папросту зачысціў ад апазіцыі інфармацыйнае поле. Унутраны фактар звязаны з палітычнай культурай апазіцыі. Яна хранічна не здольная шукаць тактычныя кампрамісы. Апошняя спроба аб'яднання мела месца ў часы «аранжавых рэвалюцый», калі быў створаны блок «Сонечная апазіцыя». Праіснаваў ён, аднак, не доўга. Урокі той гісторыі і адсутнасць эфектыўнасці паўплывалі на палітыку Захаду. Вашынгтон і Брусель у апошнія гады скарацілі прамую падтрымку дысідэнтам, робячы стаўку на трэці сектар.

***— Ці будуць мець выбары якое-небудзь асаблівае значэнне для найноўшай гісторыі Узбекістана?***

— Выбары вельмі важныя. Яны павінны зацэментаваць курс на паступовую лібералізацыю, на рост міжпартыйнага плюралізму і, як следства, выпрацоўку механізму дыялогу паміж кланамі. Важна нагадаць, што Карымаў дасюль не назваў, хто павінен прыйсці на яго месца. У адрозненні ад суседняга Казахстана, у афіцыйнай медыйнай прасторы нават няма згадкі пра тое, што ў краіне можа быць устаноўлена манархічная палітычная мадэль. Дачка Карымава Гульнара не згадваецца як пераемнік. Пры гэтым ніякай асобы, вартай Карымава, папросту няма. Таму ў перспектыве магчымыя два варыянты развіцця падзей: туркменскі (пасля смерці прэзідэнта пачынаецца вайна ўнутры кланаў, пераможца ў гэтай вайне знішчае ўсіх іншых) або ўкраінскі (нараджэнне сістэмы стрымання супярэчнасцяў паміж кланамі). Апошні варыянт азначае пашырэнне дэмакратыі. Або будзе сінтэз двух варыянтаў.

***— Ці здольная Масква неяк умяшацца ва ўзбекскія сцэнары?***

— Масква на вачах ператвараецца ў знешняга назіральніка. Уся «пятая калона» Расіі сістэмна знішчаецца. Выкарыстанне рускай мовы, акрамя побыту, папросту забаронена. Помнікі савецкіх часоў разбураныя. Эканамічна Узбекістан усё больш адрываецца ад расійскага рынку. У гэтых умовах Масква вымушана проста задавальняцца тым, што ўзбекі імкліва не бягуць на Захад. У Крамлі разумеюць, што адзіны неасцярожны імперскі крок — і ва Узбекістан вернецца амерыканская вайсковая база. Мяркую, што значна больш трывожны фактар — паўзучая ісламізацыя грамадства. Гэта, натуральна, не палітычны іслам, аднак для яго адэптаў нашмат бліжэй іранская або арабская мадэль дзяржавы, чым рэспубліка, нават у цяперашняй аўтарытарнай форме.

МЕРКАВАННЕ

# УКРАІНСКІЯ ВЫБАРЫ: ПОГЛЯД З РАДЗІМЫ ЦІМАШЭНКА

**Нягледзячы на тое, што Юлія Цімашэнка паходзіць з Днепрапятроўску, яе электаральныя пазіцыі тут вельмі слабыя. Пра гэта і іншыя аспекты кампаніі па выбарах прэзідэнта ва Украіне журналісту «НЧ» Алег Пятроў размаўляе са Зміцерам Дудачам, днепрапятроўскім гісторыкам і журналістам.**



***— Згодна сацыялагічным апытанням, цяперашнія выбары ўкраінскага прэзідэнта пройдуць у два тура. Пры гэтым у другім туры Януковіч будзе супрацьстаяць Цімашэнка. За каго прагаласуюць на радзіме Цімашэнка ў Днепрапятроўску і чаму?***

— У большасці мае землякі будуць галасаваць за Януковіча. Чаму? Думаю, што сваю ролю тут адыграў папярэдні прэзідэнт Кучма, які мае ў нас вялікі аўтарытэт. Ён быў дырэктарам буйнога мясцовага прадпрыемства «Южмаш». І падчас свайго прэзідэнцтва шмат разоў намагаўся давесці, што Юлія сваёй кар'ерай абавязана Паўлу Лазарэнку (Лазарэнка — былы старшыня ўкраінскага ўраду, які вядомы шматлікімі карупцыйнымі скандаламі. Зараз сядзіць у турме ЗША за нелегальнае адмыванне грошай). Даказаць сувязі Юліі з мафіяй Лазарэнкі не ўдалося, інакш яна была б таксама ў турме. Аднак на мазгі электарату гэты міф значна паўплываў. Акрамя таго, Цімашэнка канцэптуальна варожая мясцовай эліце. Яна ўвасабляе клан камсамольцаў канца 1980-х гадоў. Днепрапятроўск кантралюе былая гаспадарчая эліта, звязаная з крыміналам. Важна падкрэсліць, што наш рэгіён, ужо пачынаючы з 1970-х гадоў, быў адным з цэнтраў савецкага ценявога бізнесу, так званых цэхавікоў. У 1990-я гады яны знайшлі агульную мову з чыноўнікамі на базе продажу каляровых металаў. Гэта і ёсць сацыяльная прырода Партыі рэгіёнаў.

***— Аднак Юшчанка таксама належыць да генерацыі, якая прыйшла ў палітыку ў сярэдзіне 1990-х з так званых бізнес-камсамольцаў.***

— Юшчанка не ўвасабляе вобраз апазіцыі постсавецкай наменклатуры. Звычайна ён увогуле шукае кампраміс. Менавіта гэты момант, дарэчы, вельмі важны для разумення, чаму людзі галасуюць за Юлію. Цімашэнка мела ўсё і магла застацца далей ва ўладзе, аднак падняла паўстанне супраць боса Кучмы. Для яе, калі верыць яе словам, важней упісаць сваё імя залатымі літарамі ў гісторыю, а не красці грошы з бюджэту. Таму яе мітынгі не падобныя на акцыі іншых палітыкаў. Людзі ўважліва яе слухаюць. Юшчанка не мае такога рэсурсу падтрымкі.

***— А што можа радыкальна змяніцца ў выпадку, калі да ўлады прыйдзе Януковіч або Цімашэнка?***

— Нічога. Юлія не будзе радыкальна ісці на Захад, каб не страціць галасы ў цэнтры і на ўсходзе. Януковіч тым больш не пойдзе ў Расію з-за страху стаць пешкай Крамля. Увогуле, Януковіч вельмі змяніўся за апошнія гады. Ён вывучыў украінскую мову, ён стаў больш тактычна ставіцца да пытанняў, важных для выбаршчыкаў з Заходняй Украіны. Ён зараз выглядае як галоўны пераможца «аранжавай» рэвалюцыі. Усе «аранжавыя» ўсё прайгралі, а ён спакойна прыняў правілы іх гульні, маральна перамог. Цяпер засталося толькі фармальна атрымаць большасць галасоў. Гэта рэальна.

***— Вельмі важны момант для гэтых выбараў — хто будзе трэцім? На думку палітолагаў, гэта адкрые бронзаваму прызёру добры плацдарм на наступных выбарах, якія дадуць старт новаму цыклу ва ўкраінскай палітыцы.***

— Думаю, трэцім будзе ўсё ж малады Арсен Яцэнюк. Ён першы пачаў кампанію. Я падтрымліваю тэзіс пра тое, што за Яцэнюком стаіць зяць Кучмы — Пінчук, які любіць укладаць грошы ў перспектыўныя праекты. Была зроблена стаўка на раскрутку імя. Ёсць яшчэ адукаваны эканаміст, цяпер алігарх Сяргей Цыгіпка. Але я хацеў бы падкрэсліць, што для Украіны вельмі важны маральны аспект. Людзі галасавалі за Юшчанку ў 2004 годзе, таму што ён выглядаў больш сімпатычным на фоне Януковіча, які сядзеў у турме, мае відавочныя кантакты з мафіяй. Таму зараз, прынамсі сярод днепрапятроўскай інтэлігенцыі, папулярная фігура былога міністра абароны Анатоля Грыцэнкі, які прайшоў шлях ад сына селяніна, навучэнца суворАўскай вучэльні да кіраўніка Мінабароны.

***— Калі вынікі выбараў не зменяць нічога кардынальна, у чым іх глабальнае значэнне?***

— Думаю, пераадолець разрыў паміж Усходам і Захадам. Апошнім часам гэта тэма набыла нездаровы падтэкст. Самае смешнае, што — магчыма, першыню ў гісторыі — жыхары Заходняй Украіны ставяцца да жыхароў Усходняй больш талерантна. Без пераадолення падзелу на заходніх і ўсходніх украінцаў ніякія сапраўдныя змены немагчымыя.

***— У вашым рэгіёне вельмі папулярна постаць Нестара Махно. Увогуле, ён уваходзіць у дзесятку самых папулярных асоб Украіны. Чаму махноўская спадчына не эксплуатуецца сучаснымі палітыкамі?***

— Я б не сказаў. Юрый Луцэнка, міністр МУС, патрануе штогадовы культурны фестываль у Гуляйполі — рэзідэнцыі махноўскай арміі. Дзякуючы яму тут пабудаваны помнік Махно. Эксплуатацыя вобраза Махно відавочная, аднак хутчэй гэта інвестыцыі на будучыню. На фоне інфляцыі іншых ідэйных канцэпцый такая тактыка ў перспектыве можа прынесці дывідэнды.




Перадвыбарчая акцыя ў Кіеве "Кандыдаты раздаюць абяцанні"

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### АХМЕТ ЦЮРК



Старшыня турэцкай Партыі дэмакратычнага грамадства (DTP), якая прадстаўляе ў парламенце краіны інтарэсы курдскай меншасці, заявіў, што ўся парламенцкая група DTP складзе мандаты, калі ягоная партыя будзе забароненая. Падставы казаць пра магчымую забарону даюць падзеі апошніх дзён. У шасці гарадах турэцкага Курдыстана адбыліся дэманстрацыі курдскіх нацыяналістаў, якія закончыліся цяжкімі сутычкамі з паліцыяй. Шмат людзей былі параненыя. Сотні арыштаваныя. Менавіта DTP заклікала людзей выйсці на вуліцы, каб пратэставаць супраць курдскай палітыкі Анкары. У такой атмасферы некаторыя афіцыйныя палітыкі пачалі казаць пра забарону адзінай легальнай у краіне курдскай партыі. 7 снежня канстытуцыйны суд пачаў разгляд скаргі пракуратуры, якая патрабуе пазбавіць 221 курдскага актывіста права займацца палітыкай. Сярод іх 8 дэпутатаў ад DTP. Эксперты кажуць, што забарона структур DTP прывядзе да пераходу курдскага супраціву ў пазапарламенцкае прававое поле, узмоцніць структуры Курдскай працоўнай партыі, якая з сярэдзіны 1980-х гадоў змагаецца за незалежнасць Курдыстана партызанскімі метадамі. З іншага боку, урад Эрдагана мусіць неяк рэагаваць на крытыку з боку турэцкай нацыяналістычнай апазіцыі. Некаторыя разглядаюць нядаўнія спробы ўраду пашырыць культурныя правы курдаў як першы крок да падзелу Турцыі на дзве краіны. Курды, між тым, лічаць, што атрыманае права размаўляць на роднай мове — гэта занадта мала, і мараць пра стварэнне аўтаномнай вобласці.

### РЫТ БЬЕРГААД



Мэр Капенгагена, дзе праходзіць Міжнародны кліматычны форум, увяла ў горадзе ледзь не вайсковае становішча. Аднак толькі паляваннем на левакоў і эколагаў улады не абмежаваліся. Дзіўным чынам ахвярамі мераў перасцярогі сталі жрыцы кахання. Зразумела, што дзяўчаты не хацелі прапусціць такой падзеі, як гэты форум, на які прыехалі некалькі тысяч іншаземцаў — патэнцыйных кліентаў. Аднак такі сцэнар падзей прадбачылі ў мэрыі. У выніку пачалася кампанія супраць «начных матылькоў». Ва ўсе 160 гатэляў горада накіраваныя агенты. Там жа можна пабачыць плакаты: «Будзь адказным — не набывай секс». Між тым, прастытуцыя ў Даніі легальная. Прыкладна 6 тысяч чалавек зарабляюць гэтым на жыццё і, адпаведна, плацяць падаткі. Натуральна, палітыка Рыт Бьерггад захаплення ў іх не выклікала. Старшыня прафсаюза прастытутак Сьюзан Молер рыхтуе скаргу ў суд наконт парушэння правоў грамадзян. Акрамя таго, яна заявіла, што ў знак пратэсту прастытуткі будуць аказваць паслугі супрацоўнікам мэрыі бясплатна.

### УЛАДЗІМІР ЖЫРЫНОЎСКІ

Гэтымі днямі Ліберальна-дэмакратычнай партыя Расіі (ЛДПР), старшынёй якой ён з'яўляецца, святкуе 20-ю гадавіну свайго нараджэння. Роўна 20 гадоў таму ў снежні 1989 года была створана Ліберальна-дэмакратычная партыя Савецкага Саюза, якая стала правобразам цяперашняй ЛДПР. У наступным годзе Мінюст нечакана зарэгістраваў яе. Гэта была першая афіцыйна зарэгістраваная апазіцыйная партыя ў СССР. Такім чынам, у цяперашняй Расіі ЛДПР — самая старая партыя. Між тым, эпізод з нечаканай рэгістрацыяй выглядае вельмі дзіўна. Тым больш, што пачынаў Жырыноўскі як сацыял-дэмакрат і быў далёка не першым чалавекам у партыі. Таксама вядома, што амаль 90 працэнтаў сяброў партыі на момант рэгістрацыі былі жыхарамі горных вёсак Абхазіі, дзе іх запісвалі ў партыю пад ціскам на той час яшчэ камуністычнай адміністрацыі. У любым выпадку, святочныя мерапрыемствы з нагоды дня нараджэння ЛДПР былі маштабнымі. Удзельнікі мерапрыемства, якое адбылося ў цэнтры Масквы, выказалі шмат аптымістычных слоў наконт перспектыў партыі. Аднак каментатары больш скептычна ставяцца да будучыні ЛДПР. Фактычна гэта партыя адной асобы — Жырыноўскага. Хто можа змяніць Вольфавіча — не зразумела.



▸ З НАГОДЫ

# БЕРЛІНСКІ МУР У ПЫТАННЯХ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

9 лістапада 1989 года ўвайшло ў гісторыю Германіі як дзень, калі ўпаў Берлінскі мур. Аб'яднанне Заходняга і Усходняга Берліна сённяшнія палітыкі разглядаюць як сімвал аб'яднання Еўропы, у ХХ стагоддзі падзеленай на два лагеры гістарычнымі катаклізмамі. Аб'яднання, якое адбываецца значна цяжэй, чым трагічнае раз'яднанне. Але сам факт, што ўсяго за адну ноч 13 жніўня 1961 года не ментальная, а самая што ні ёсць матэрыяльная перагарода з бетону і жалеза раздзяліла, нібы для якогасьці пачварнага эксперыменту, звычайны еўрапейскі горад, яшчэ доўга будзе шакаваць уяўленне людзей ды служыць аб'ектам аналізу не толькі палітолагаў, але і культуролагаў, сацыёлагаў, даследчыкаў архітэктуры ды урбаністыкі.

Беручы ўдзел у міжнародным праекце для журналістаў — адным з соцень мерапрыемстваў, прыўрочаных да святкаванняў 9 лістапада, я спрабавала адшукаць адказы на самыя розныя, часам нават элементарныя пытанні, якія паўставалі ў мяне пры сутыкненні з тэмай Берлінскага муру, з тэмай узаемаадносінаў ГДР і ФРГ, СССР і краінаў Захаду. Адказамі, знойдзенымі па абодва бакі парушанага Муру, я дзялюся з шаноўным чытачом.

Нягледзячы на тое, што ў беларускай мове пад уплывам рускай традыцыі замацавалася ўстойлівае словазлучэнне «Берлінская сцяна», мной будзе ўжывацца форма «Берлінскі мур» як больш сутнасна і фармальна адэкватны пераклад нямецкага *Berliner Mauer*.



Юрген Літфін, брат першай ахвяры Берлінскага муру, паказвае, як выглядала мяжа з усходняга боку

## УСХОД: СУМНАЕ ХОБІ ЮРГЕНА ЛІТФІНА

Зранку на Келер-штрасэ, якая ляжыць у самым цэнтры берлінскага квартала Мітэ, — амаль бязлюдна. На вуліцы адно пенсіянеры з сабачкамі. «Вы адразу пазнаеце музей, — настаўляюць нашы праваднікі, — гэта павінна быць шэрая вежа, што тырчыць пасярод поля». Але па гэтых прыкметах знайсці былую памежную вышку Усходняга Берліна не атрымліваецца: бетонную будову, падобную да трох пастаўленых слупочкам дзіцячых кубікаў, паўкалодзежам атачаюць высокія жылыя дамы — ахайныя і бела-ружовыя, як бабруйскі зефір.

На пляцоўцы ля вышкі акуратна прыпаркаваны сіні аўтамабільчык. Яго кіроўца — без малага 70-гадовы Юрген Літфін — ужо чакае нас. Пенсіянеры, што праходзяць па вуліцы, вітаюцца з ім, як з суседам. Уся сцэна выглядае так мірна, нібы перад намі галубятня, а Юрген, як і штодня, прыехаў дагледзець любімых птушак. Або, калі паддавацца аўры кварталу, — пакарміць котак. Толькі яго коткі — мы, турысты-журналісты. А за намі — група школьнікаў малодшых класаў, якая вісне на парэнчах і гуляецца «ў кіча» вакол вышкі, калі мы пакідаем яе.

«Асцярожна са сценамі: іх толькі што пафарбавалі», — папярэджвае Юрген і грыміць ключамі ад свайго трохпавярховага бетоннага «лецішча». Інтэр'еры вышкі і сапраўды свежапакрытыя практычным вапняком шэра-блакітнага колеру. Можна не сумнявацца — аўтэнтычнага.

Музей-вышка — недзяржаўны аб'ект і, што асабліва падкрэсліваецца, ніякіх датацый ад дзяржавы не атрымлівае. Гэты музей — сумнае хобі Юргена Літфіна, роднага брата першай ахвяры Берлінскага муру. 24-гадовы Гюнтэр Літфін быў застрэлены 24 жніўня 1961 года непадалёк ад гэтага месца пры спробе ўцячы ў Заходні Берлін. Грамадскі фонд «Памятная мясціна Гюнтэра Літфіна», як афіцыйна называецца цяпер вышка, існуе на ахвяраванні грамадзян. На апошнім ярусе вышкі, у куце якога — манекен, апрануты ў форму ўсходненямецкага памежніка, па задуме Юргена Літфіна наведнікі музея дазнаюцца, як загінуў яго брат Гюнтэр.

Вышка пасярод голага поля — характэрны пейзаж наваколля Берлінскай сцяны ў 1980-я: каб тэрыторыя добра прастрэльвалася, з усходняга боку па ўсёй даўжыні мяжы былі знесеныя жылыя пабудовы. Але тут сцяны не было: падзел на сектары ішоў па вадзе параўнальна вузкага канала Шпандаў. Відаць таму гэтае патэнцыйна «слабое звяно» прывабіла Гюнтэра: з 13 жніўня, калі сцяну пачалі будаваць, па самы дзень смерці праз два тыдні, расказвае Юрген, яго брат ездзіў на роварах па Усходнім Берліне, шукаючы прыдатнае месца для ўцёкаў. Складаючы свой план, хлопец не ведаў толькі аднаго: урад ГДР, па ўзгадненні з савецкімі таварышамі, ужо аддаў загад страляць па ўцекачам на паражэнне.

Бацька Гюнтэра і Юргена быў дзеячам апазіцыйнай у ГДР партыі Хрысціянска-дэмакратычны саюз. Ужо ў 1950-я гады сям'я, палітычныя погляды якой не віталіся ў соцкраіне, падумвала пра пераезд у ФРГ, але не магла здзейсніць яго адкрыта, бо знаходзілася пад пільным наглядам «Штазі». Хлопцам як дзецям дысідэнтаў было забаронена атрымліваць вышэйшую адукацыю, таму абодвум давялося ісці ў рамеснікі. Юрген вывучыўся на слесара, а Гюнтэр стаў краўцом, спецыялістам па тэатральных касцюмах. «Усё яго жыццё і праца былі звязаныя з багемнымі коламі Заходняга Берліна, — расказвае Юрген, раскрываючы на стэндзе здымак, дзе яго брат танчыць на вечарынцы з прыгожай, падобнай да Мэрылін Манро бландынкай. — Ён набыў там кватэру, мы зрабілі рамонт, і брат планаваў пераезд — але раптам збудавалі сцяну». У адну ноч усе 80 пераходаў паміж савецкім сектарам Берліна (Усходнім Берлінам) і трыма саюзніцкімі (Заходнім Берлінам) былі перакрытыя. Простыя берлінцы, якія да гэтага ўсё-ткі былі жыхарамі адзінага горада, апынуліся па два бакі мяжы, суровасць якой яшчэ не ўсведамлялі. Малады Гюнтэр ніяк не мог прыняць гэтага падзелу. Але пра намер уцячы не расказаў нікому, нават брату. Пра смерць Гюнтэра Літфіна родныя пачулі па заходнеберлінскім радыё.



Цяпер з былой памежнай вышкі ГДР добра праглядаюцца кватэры бела-ружовых зефірных домікаў

Ужо ў 1990-я гады, калі былі адкрытыя архівы ГДР, Юрген дазнаўся, як усё было ў дэталях і як звалі забойцу яго брата. На момант 20-годдзя падзення сцяны дакументальна было пацверджана, што на мяжы застрэлілі 136 чалавек, аднак сапраўднай лічбы не ведае ніхто: неўзабаве пасля 13 жніўня памежнікам было загадана спыніць дакументацыю. Але паколькі смерць Гюнтэра была першай, яна была рупліва запратакалаваная — нават вядома, колькі куляў было выпушчана па водах канала Шпандаў.

«Гюнтэр не чакаў, што пачнуць страляць, — расказвае Юрген. — Пра гэта сведчыць тое, што, даплыўшы да сярэдзіны каналу, ён спыніўся і падняў рукі ўгару. І тады, як сведчыць рапарт, «памежнік Герберт Плаўль 1938 г. н. пераключыў рассеяны агонь на прыцэльны» і застрэліў майго брата стрэлам у патыліцу. То бок, забіў чалавека, які ўжо здаўся. Гэта было забойства».

З былым памежнікам Плаўлем Юрген не знаёмы, але, відаць, ведае пра яго ўсё. Ці здагадваецца: «Навошта мне з ім сустракацца, з гэтым недавукам з вёскі, адзіным шляхам зрабіць кар'еру для якога было прыехаць у Берлін і забіваць людзей на мяжы? Цяпер ён адстаўны вайсковец, Бундэсвер плаціць яму вялікую пенсію, а за забойства майго брата пасля судовага працэсу, які мы ініцыявалі ў 1997 годзе, ён атрымаў два гады ўмоўна».

Ва ўсенямецкім апытанні, каго грамадзяне краіны лічаць самымі вялікімі немцамі за ўсю гісторыю дзяржавы (аналагічным кампаніі «Імя Расіі» падчас якой «перамаглі» Сталін, Сталыпін і Аляксандр Неўскі) першае месца заняў аб'яднальнік Германіі Ота фон Бісмарк. Другое — брат і сястра Ганс і Сафія Шоль, кіраўнікі студэнцкай антыфашысцкай арганізацыі «Белая ружа», якая, нягледзячы на самазабойчы характар такой дзейнасці, існавала ў Трэцім Рэйху ў 1942–1943 гадах, заклікаючы немцаў да пасіўнага супраціву фашызму і грамадзянскай мужнасці. Гэта сведчыць пра тое, наколькі важная для федэратыўнай Германіі ідэя адзінай нацыі і наколькі ў гэтай краіне цэніцца подзвіг простага чалавека, яго маленькі ўклад у агульную справу.

У юбілейныя дні берлінскі пенсіянер Юрген Літфін, які парадаксальным для большасці як заходніх, так і ўсходніх немцаў чынам захоўвае памяць пра брата ў памежнай вартавой вышцы, — знакамітасць узроўню Міхаіла Гарбачова: рэпартажы пра яго музей мы бачылі нават у нямецкіх глянцавых часопісах. Экспазіцыя на апошнім паверсе вышкі (усяго ўздоўж мяжы іх стаяла больш за 300, а захавалася — дзве) сімвалічным чынам звязвае Гюнтэра Літфіна з апошняй ахвярай Муру — 20-гадовым Крысам Гефроем, якога застрэлілі 5 лютага 1989 года. Такім чынам лагічна завяршаецца 28-гадовая гісторыя Берлінскай сцяны, расказаная праз лёс канкрэтнага чалавека. Мы спускаемся назад на Келер-штрасэ: час запускаць школьнікаў.

Сцяны ў гэтым месцы ніколі не было, але ўздоўж канала пралягала дарога, па якой ездзілі памежныя патрулі. Наноў забудоўваючы такую каштоўную пасля аб'яднання Берліна зямлю «паласы смерці» выгодным жытлом, улады горада пакінулі гэту дарогу. Цяпер па ёй, забрукаванай клінкерам, спрытна абмінаючы пенсіянераў з сабачкамі, раз-пораз праносяцца аматары ранішніх прабежак. Да канала Шпандаў збягаюць мемарыяльныя прыступкі. Цяпер і з усходняга боку да вады, дзе напаткаў смерць Гюнтэр Літфін, можна падыйсці.

### Хто і навошта пабудаваў Берлінскі мур?

Мур быў ініцыятывай і ўласнасцю сацыялістычнага блоку. Школьнікам ГДР настаўнікі забаранялі называць Мур Мурам — афіцыйна ён называўся «загародай супраць фашысцкай і капіталістычнай агрэсіі». Але сапраўднай прычынай закрыць мяжу стала тое, што з самага свайго ўтварэння ў 1949 годзе ГДР імкліва губляла маладое насельніцтва: было выгодней атрымліваць бясплатную адукацыю ў ГДР, а працаваць у ФРГ. Паміж сацыялістычнай экономікай Усходу і рынкавай Захаду існавала негалоснае спаборніцтва, і ГДР яго заўважна прайгравала. За 1950-я гады на Захад пераехала каля 3 мільёнаў усходніх немцаў.

Менавіта дзякуючы Муру і строгай мяжы паміж ГДР і ФРГ апошняя здавалася ўсходнікам прывабней, чым была дагэтуль. І, можа, таму туды так ірваліся. І, можа, тым мацнейшым было расчараванне, і таму здараліся славутыя неадаптацыі людзей сацыялістычнага выхавання ў капіталістычным свеце...

### Як так можа быць, што Мур вырас за адну ноч?

З 13 па 15 жніўня 1961 года Заходні Берлін абцягнулі нізкай сеткай з калючага дроту — гэта і была першая сцяна. Паколькі 13 жніўня было нядзеляй, пра сцяну многія берлінцы дазналіся толькі 14 жніўня, калі іх не пусцілі на працу ў іншы сектар — гэта павялічыла эфект нечаканасці. У першыя дні на захад уцяклі больш за 200 памежнікаў. Тады ў памежныя войскі салдат сталі набіраць з аддаленых рэгіёнаў ГДР, пазбягаючы ставіць землякоў у адзін каравул, каб не было змоваў. Тады ж пачалося будаўніцтва асноўнай загародкі — з пустацелых блокаў. Блокавую сцяну можна было пратараніць нават пластыкавым ГДРаўскім аўто-трабантам, таму неўзабаве блокі замянілі трывалымі бетоннымі плітамі.

### Як выглядаў Мур з усходняга боку?

У 1975 годзе Мур набыў свой канчатковы выгляд. Для многіх усходнеберлінцаў, каму ўдавалася скокнуць праз бетонную агароджу, было адкрыццём, што яны бачылі з горада толькі знешнюю фартыфікацыю. Уцекачы трапля-

# І АДКАЗАХ

лі ў так званую «паласу смерці», застаўленую вышкамі, замініраваную, патруляваную машынамі і аўчаркамі: заставалася яшчэ метраў 100 да муру № 2, — асноўнага, якім яго бачылі заходнія немцы. Зразумела, зверху ўсё было абцягнута калючым дротам. У знешнім муры былі «службовыя» дзверкі ў Заходні Берлін.

Мур падкопвалі, яго пераскоквалі з шастамі і пералятали на самаробных дырыжаблях ды аэрапланах. Памежнікі перагарадзілі Шпрэе падводнымі кратамі, устанавілі датчыкі ў зямлю, каб слухаць, ці не рыюць тунелі, засялялі дамы, што прылягалі да Муру, сексотамі. Гэта былі 28 гадоў няспыннага «тэхнічнага прагрэсу».

## Як выглядаў Мур з заходняга боку?

Агульнавядома, што на Захадзе да Муру можна было падыйсці, памацаць і нават пакінуць на ім графіці, чым з ахвотай карысталіся знакамітыя мастакі з усяго свету. Менш вядома, што гэта было небяспечна: дзеля эканоміі пры пабудове Муру ўлады ГДР зразалі вуглы, пакідаючы за сабой права патруляваць тэрыторыю, якая засталася на Захадзе. Так што захопленага працай мастака, які маляваў на Муры, памежнік мог зацягнуць у «паласу смерці» праз адкрытыя ў Муры дзверкі і пакараць за псаванне маёмасці ГДР. Добрапрыстойныя бюргеры ведалі гэта і ўвогуле баяліся падыходзіць да Муру. Жыць побач азначала штодня чуць стрэлы, фізічна адчуваць напругу ў савецкім сектары. Жытло каля сцяны было танным, і там сяліліся ў асноўным эмігранты і дэкласаваныя элементы. Пасля 9 лістапада ўсё перакулілася: задворкі заходняга Берліна апынуліся ў самым цэнтры аб’яднанага горада.

У 1988 годзе дзве прадстаўніцы мастацкай супольнасці Заходняга Берліна Сінція Біт і Цільда Свінтан знялі дакументальны фільм «Cycling the Frame» («На ровары ўздоўж рамкі»). Шэрая рамка вакол сакавітай каляровай карціны — менавіта так успрымалі Мур заходнеберлінцы.

## Ці маглі жыхары Заходняга Берліна ездзіць ва Усходні?

Роберт — філолаг, які выдатна размаўляе па-руску і які правёў студэнцкія гады ў Заходнім Берліне 1980-х, расказвае, што грамадзяне не толькі Заходняга Берліна, але ФРГ і любой краіны Заходняга блоку маглі адносна свабодна выпраўляцца на аднадзённы шпацыр ва Усходні Берлін: «Сакрэт такой лаяльнасці палягаў у аднадзённай візе: яна каштавала 25 заходніх марак — грошы на той час адчувальныя, і для кіраўніцтва ГДР гэта быў добры бізнес. Да таго ж, паводле законаў ГДР, вы былі абавязаныя памяняць пэўную суму заходніх марак на мяжы, а назад мяняць было нельга. Пакідаеш савецкі сектар — або здавай грошы на мытні, або выкідай».

Ва Усходні Берлін Роберт вадзіў на экскурсію амерыканскіх сяброў. Прычым мэтай культпаходу быў не толькі «запаведнік таталітарызму» — ва ўсходняй частцы засталіся Домскі сабор, Востраў музеяў і іншыя помнікі агульнанямецкай спадчыны. Немцы ставіліся да такога турызму насцярожана. Яшчэ Роберт хадзіў туды ў кнігарні: купляў слоўнікі і кнігі па русістыцы — шыкоўна выдадзеныя, яны каштавалі капейкі. «Праз гэтыя рускія кнігі, калі я вяртаўся дадому, мяне аднаго разу завялі ў бокс і доўга дапытвалі: гэта было непрыемна і магло для мяне кепска скончыцца», — згадвае Роберт.

Але галоўнай мэтай візіту на Усход было адведаць сваякоў: Мур падзяліў многія сем’і. Вярнуцца на Захад трэба было да 2-й гадзіны ночы. Ля пераходу на Фрыдрыхштрасэ, у будынку, вядомым як «Палац слёз», уночы развітваліся жыхары Заходняга і Усходняга Берліна.

## Ці маглі жыхары Усходняга Берліна ездзіць у Заходні?

У Заходні Берлін выпускалі лічаных ГДРаўцаў пасля суровых праверак. Але з выхадам на пенсію любы грамадзянін ГДР атрымліваў права ездзіць на Захад. Сацыялістычнай дзяржаве важна было затрымаць на сваёй тэрыторыі моладзь і працоўную сілу, а пенсіянеры карысці не прыносілі. На Захадзе, па законах ФРГ, усходнія старыя атрымлівалі бясплатнае лячэнне. Да таго ж пасля праходу мяжы кожны грамадзянін ГДР меў права на «прывітальныя грошы» — 100 марак. Узяўшы гэтыя грошы ў банку, старыя закупаліся дэфіцытнымі прадуктамі і везлі іх на Усход, дзецям.

## Як яшчэ ГДР зарабляў на ФРГ?

Сцяна падзяліла не толькі вуліцы — яна прашыла воды Шпрэе, а таксама метро і каналізацыю. Лініі У–6 і У–8 берлінскага метро пачыналіся і заканчваліся ў Заходнім Берліне, а пасярэдзіне былі станцыі, якія належалі Усходняму. Усе гэтыя станцыі цягнік праязджаў без спынення, апроч Фрыдрыхштрасэ — дзе быў чэкпойнт. На гэтай станцыі стаяў ларок са спіртнымі напоямі, які карыстаўся папулярнасцю ў жыхароў Заходняга Берліна: тыя ездзілі па таннейшую выпіўку — і нават без віз.

Але галоўнае, раз на год ФРГ выкупала палітвязняў, якія трапіліся пры спробе ўцячы з ГДР або на акцыях пратэсту. За галаву на Усходзе бралі ад 40 да 150 тысяч марак, у залежнасці ад узроўню адукацыі «злачынцы» — часам не грашыма, а таварамі. Прадавалі палітвязняў толькі пры ўмове, што ў нагрузку Захад выкупіць яшчэ і крымінальнікаў. Гэтыя каштавалі танней. «Я жыў побач з адным такім у Заходнім Берліне, — расказвае Роберт. — Ён зарэзаў жонку на Усходзе і казаў, што і нам такое будзе. Нідзе не працаваў, да ночы піў з сябрукамі і буяніў. Тэрарызаваў дом тры гады, пакуль мы скаргамі не дамагліся яго адсялення».

## Ці «ўцякалі» людзі з Заходняга Берліна ва Усходні?

У ГДР з ФРГ у розныя гады свядома пераехалі жыць некалькі дзеячаў сацыялістычных пераканняў. Сярод іх — драматург Бертольд Брэхт і бацька канцлера Германіі Ангелы Меркель, лютэранскі пастар.

## Як так можа быць, што Мур рухнуў за адну ноч?

Вядома ж, усё пачалося задоўга да ночы падзення Муру. І не ва Усходнім Берліне, насельніцтва якога было збольшага пасіўным і лаяльным рэжыму праз шматгадовы адбор і чысткі. З усёй краіны дысідэнты з’язджаліся ў Лейпцыг. Актывіст мірнай рэвалюцыі 1989 года Олівер Клос у 1982 годзе пераехаў у Лейпцыг з Дрэздэна і, нягледзячы на атэістычныя перакананні, паступіў на тэалагічны факультэт Лейпцыгскага універсітэта. «Царква ў ГДР існавала асобна ад дзяржавы і стала рухавіком апазіцыйнага руху, — расказвае Олівер, — а на тэалогіі мы мелі магчымасць вучыцца па перадавых заходніх методыках, да нас прыязджалі выкладаць прафесары з Захаду, якія прывозілі кнігі». Другой падрыўной сілай рэжыму былі абаронцы прыроды: індустрыя ГДР не дбала пра экалогію, неба над Лейпцыгам круглы год было жоўтым.

У 1988 годзе вакол пратэстанцкай абшчыны кірхі святога Мікалая ў Лейпцыгу сталі групавацца нязгодныя. Зборы адбываліся па панядзелках, хутка людзі перасталі змяшчацца ў храме і выйшлі на плошчу. «Штазі» запалохвала мірных дэманстрантаў кровапраліццем, ладзіла жорсткія разгоны, але людзей гэта не спыняла. Сімвалам мірнай рэвалюцыі былі свечкі: калі нясеш у руках зніч, у іх няма месца зброі. Людзі патрабавалі дэмакратычных выбараў і «бязвізавы праезд аж да Гаваяў». У панядзелак 9 лістапада 1989 года берлінцы даведаліся, што ў Лейпцыгу адбываецца стотысячная дэманстрацыя, а фольксапаліцаі не страляюць.

Цікава, што ўсходнеберлінскія дысідэнты і не марылі зрушыць Мур: для іх яго падзенне было шокам. Гэта быў парыў простых немцаў, якія прагнулі ўз’яднацца з роднымі на Захадзе, зірнуць на начное жыццё вуліцы Курфюрстэндам. Эфектнае ламанне пачалося выпадкова і, можа, таму выглядала як цуд: нешта, ува што ні на Захадзе, ні на Усходзе не магі да канца паверыць: лічыцца, што партыйны функцыянер Гюнтэр Шабоўскі агаварыўся, сказаўшы ў прамым эфіры, што ўказ пра адкрыццё межаў ГДР уступае ў сілу «неадкладна». І людзі рушылі ў бок Муру, а памежнікі не сталі іх стрымліваць.

У Лейпцыгу сімвалам перамогі над рэжымам стаў момант, калі дэманстранты занялі будынак «Штазі».

## Ці сапраўды нямецкая мяжа паміж Захадам і Усходам існуе дагэтуль — у галовах немцаў?

Сёння, у эпоху дэкаратыўнага бетону, калі парэшткі Муру размеркаваныя па музеях і сувенірных крамах, калі акторы-эмігранты з Расіі і Польшчы, пераапранутыя ў савецкага і амерыканскага салдатаў, пазіруюць турыстам на фоне Брандэрбургскай брамы, немцы нарэшце выглядаюць непадзельнай шчаслівай нацыяй. Але мой знаёмы беларус, які шмат год працуе ў Берліне, іначай глядзіць на сітуацыю:

«Гэта не афішуецца, але сучасная Германія — гэта сумная гісторыя самасцвярджэння багатых заходнікаў за кошт бяднейшага Усходу і складанае перапляценне ўзаемных крыўдаў. Адна з самых застарэлых — тое, што ўсходненямецкая прапаганда абвясціла ФРГ спадчыннікам нацызму, а сябе — новай Германіяй, што, зразумела, было дэмагогіяй. Дарэчы, менавіта па гэтай прычыне, калі нацызм і ўзнімае галаву ў Германіі, то — у былой Усходняй: на Захадзе немцам з дзяцінства прышчэплівалі комплекс віны за злачынствы продкаў. Усходнія немцы пачынаюць ненавідзець мусульманскую эміграцыю з чыстага ліста.

З іншага боку, пасля аб’яднання выявілася, што ў ГДР перабольшвалі заможнасць заходніх суседзяў. Нядзіва, што большасць немцаў на Усходзе сцвярджаюць: пры сацыялізме яны жылі лепей».

«Тады чаго ж яны аб’ядноўваліся?» — пытаюся я.

«Цябе гэта, можа, здзівіць, але таму, што слова «Свабода» для гэтай краіны значыць вельмі і вельмі шмат. У якую Германію не трапіў бы сёння беларус — Заходнюю ці Усходнюю — у плане любові да свабоды яму ёсць чаму павучыцца».



Фота з Музея дакументацыі Берлінскай сцяны выяўляе Бернаўэр-штрасэ ў 1961 годзе. Рабочыя Усходняга Берліна ўзводзяць мур, памежнікі ГДР пільнуюць рабочых і адно аднаго, жыхары Заходняга Берліна ў чаканні аўтобуса



### З Усходу на Захад: вышэй ногі ад зямлі

Мультымедыя-выстава «Placemaking» перформеркі Штэфані Бюркле, што адчынілася ў Берліне на Унтэр-дэн-Ліндэн 26 лістапада, раскрывала тэму падзелу Германіі вачыма эмігрантаў, якія да 1989 года жылі па абодва бакі Муру. Заваленая сыпучымі падушкамі-мапамі Берліна зала, відаць, мусіла нагадваць маладым немцам знаёмы вобраз дзяцінства: пакой для рэлаксацыі ці кабінет псіхолага нямецкай пачатковай школкі. Можна было валяцца на падушках, слухаючы запісы інтэрв’ю з эмігрантамі, а можна было гуляцца ў гульню кшталту «Менеджэр», перастаўляючы азіяцкія фігрукі па контурнай мапе Берліна. «Гульнявая» атмасфера выставы здалася мне выдатнай метафарай Берлінскага муру. Калі дзяржаўная мяжа праходзіць па жылым доме — гэта або тэатр абсурду, або ўмоўнасць дзіцячай гульні. Уцёкі з Усходу на Захад, напрыклад, у дакументальных хроніках выглядаюць як піянерскія «Зарніцы» — вось толькі страляюць і забіваюць там па-сапраўднаму. У Лейпцыгскім музеі сучаснай гісторыі Германіі паказваюць кінахроніку: два чалавекі пераплываюць раку Шпрэе: вада знаходзіцца пад юрысдыкцыяй ГДР, а заходні бераг — ужо заходняя тэрыторыя. За ўцекачамі гоніцца памежны катэр, чуюцца стрэлы. Але варта хлопцу пакласці руку на заходні бераг, як стрэлы спыняюцца, а катэр разварочваецца, хоць памежнік можа дацягнуцца да парушальніка: нельга. «Я трымаю цябе за руку, значыць, ты на Захадзе!» — крычыць заходні берлінец, выцягваючы з вады дзяўчыну. Нямецкая педантычнасць?

### Падзяка

Гэты матэрыял — вынік трэнінгу для маладых журналістаў, арганізаванага 24–28 лістапада 2009 года ў Берліне моладзевай ініцыятывай «Точка-Treff» і прызначаны таксама для публікацыі на сайце to4ka-treff.de.

«Точка-Treff» — супольны праект Гётэ-інстытутаў у рэгіёне Усходняя Еўропа /Сярэдняя Азія і Фонду «Германа-расійскі моладзевы абмен».

Шчыра дзякую супрацоўнікам Берлінскага Гётэ-інстытута Роберту Касону, Ёргу Зільберману і каардынатарцы «Точка-Treff» Даніэле Ханэман за добра прадуманую, прафесійна праведзеную і інфарматыўна насычаную праграму, а свайму калегу карэспандэнту газеты «Звязда» Глебу Лабадзенку — за творчую кампанію і супольную працу ў праекце.

▸ ГАДАВІНА

# ХОЧАМ У ЛЮДЗІ — БУДЗЬМА БЕЛАРУСАМІ!

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Першы год жыцця чалавека — гэта яго досвітак. Бо менавіта ў пачатковы перыяд выяўляюцца асноўныя рысы характару немаўляці, яго тэмперамент і здольнасці. Гэтыя відавочныя жыццёвыя паралелі сталі лейтматывам святочнага канцэрта, які на пачатку тыдня адбыўся ў тэатры Беларускай драматургіі. Урачыстасць была прысвечана дзейнасці вядомай грамадскай ініцыятывы «Будзьма!», якая святкавала сваю першую гадавіну.**

Вядучыя імпрэзы, знакамітыя беларускія артысты Таццяна Беланогая і Андрусь Такінданг не раз падкрэслівалі, што сваім няўрымслівым характарам кампанія «Будзьма!» абавязана сваім бацькам-заснавальнікам, найперш, цяперашнім каардынатарам — Алене Макоўскай і Ніне Шыдлоўскай, Ігару Лялькову і Севярыну Квяткоўскаму, як і многім іншым валанцёрам сучаснага Нацыянальнага адраджэння, якія згуртаваліся пад сцягамі кампаніі «Будзьма!».

Грамадская ініцыятыва «Будзьма!» сёння — гэта безупынная плынь канкрэтных спраў, праектаў, накіраваных на тое, каб адрадзіць у беларусаў павагу да ўсяго беларускага: літаратуры, паэзіі, выяўленчага мастацтва, музыкі. Але, найперш, да роднай мовы. Дзеля дасягнення гэтай мэты рэгулярна праводзяцца сустрэчы пісьменнікаў і музыкантаў не толькі са сталічнымі слухачамі, але і з жыхарамі невялікіх мястэчак і вёсак, для якіх культура часцяком абмяжоўваецца парай-тройкай расійскіх тэлеканалаў, якія транслююцца ў той мясцовасці.

І таму жывыя сустрэчы з беларускімі творцамі ўспрымаюцца нашымі землякамі з натхненнем, як адкрыццё нязведанага мацерыка, назва якому — Беларушчына. Аўтар гэтых радкоў сам змог упэўніцца ў плённасці такіх накірункаў дзейнасці кампаніі «Будзьма!», калі разам са сваім калегам журналістам Віталём Мартыненкам па ўсёй Беларусі прэзентаваў сумесную кнігу «222 альбомы беларускага року і не толькі…» Маршруты музычных сустрэч праляглі ў мінулы год па ўсёй краіне: прэзентацыі ладзіліся ў Гродна і Магілёве, Гомелі і Мазыры, Оршы і Наваполацку.



Але мэты кампаніі — гэта не толькі сустрэчы з цікавымі людзьмі нашай краіны. «Будзьма!» — гэта і прэзентацыі кніг, і мастацкія выставы, і паэтычныя вечарыны, і гістарычныя вандроўкі, і арганізацыя конкурсаў для моладзі. Такіх імпрэзаў, па словах каардынатара кампаніі Ігара Лялькова, сёлета была праведзена рэкордная колькасць — 900! Гэта немагчыма было б ажыццявіць, калі б яшчэ каля 30 нацыянальных арганізацый не сталі партнёрамі кампаніі «Будзьма!».

Ганаровымі гасцямі канцэрта-віншавання сталі знакамітыя творцы, сярод якіх былі народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін, пісьменнік Уладзімір Арлоў, паэты Генадзь Бураўкін і Леанід Дранько-Майсюк, мастак Рыгор Сітніца.

Добрыя словы і абнадзейлівыя звесткі пра дзейнасць кампаніі «Будзьма!» гучалі са сцэны, абмяркоўваліся ў кулуарах. Але ў іх была не пыха ад здзейсненага, а думка, што дзіцятка толькі нарадзілася — а такое жвавенькае! Гэткі пазітыўны настрой, па задумах арганізатараў канцэрта, павінен быў замацавацца музычнымі сродкамі. Тым больш, што супрацоўніцтва з беларускамоўнымі выканаўцамі — адзін з магістральных накірункаў у праграме дзейнасці кампаніі «Будзьма!». Галоўнае тут — арганізацыя канцэртаў і фэстаў, выданне дыскаў з беларускамоўнай музыкай, спрыянне больш шырокаму ўдзелу беларускіх музыкаў у літаратурным руху Беларусі. Добрым прыкладам творчых тандэмаў, якія з'явіліся дзякуючы супрацоўніцтву з «Будзьма!», можна назваць літаратурна-музычныя дуэты Барадулін — Камоцкі, Дранько-Майсюк — Акулін, а таксама тандэм апошняга часу Якавенка — Плясанаў.

Сустрэча з некаторымі з гэтых актыўных удзельнікаў кампаніі «Будзьма!» слухачоў чакала напрыканцы. А найперш святочную сцэну аддалі маладому, але даволі вопытнаму канцэртнаму калектыву — гурту «UNIA». Пад жвавыя рытмы фолк-рока і гукі беларускай дуды музыканты гурта выканалі некалькі вядомых апрацовак. Але найбольшымі апладысментамі была ўганаравана цудоўная беларуская песня «Крынічанька», якая і прынесла гурту «UNIA» шырокую вядомасць і лаўрэацкія званні шматлікіх рок-фэстаў. Было бачна, што, распачынаючы праграму канцэрта, музыканты «UNIA» не фарсіравалі свой шырока вядомы музычны драйв, а імкнуліся засяродзіцца на меладычным складніку ўласных кампазіцый і яскравым шоу.

Гурт «UNIA» змяніў на сцэне дасціпны і разважлівы Алесь Камоцкі, якія пад агульныя апладысменты выканаў музычныя віншаванні для жаночай часткі каардынатараў кампаніі «Будзьма!» — Алены Макоўскай і Ніны Шыдлоўскай. У якасці падарункаў прагучалі кампазіцыі з альбома «З бацькоўскай кружэлкі» «У добры шлях» і «Зорка босая» на вершы прысутнага Рыгора Барадуліна. Рыгор Іванавіч таксама ўзняўся на сцэну і выказаў нямала ўдзячных слоў тым людзям, якія так шмат робяць для развіцця беларускай культуры і мовы ў шматлікіх яе сучасных формах.

Кумір маладых беларускіх слухачоў Лявон Вольскі выходзіў на сцэну двойчы — разам з гітарыстам П. Трацціяком выканаў некалькі сваіх знакамітых песень, а таксама ў складзе абноўленай «Крамбамбулі». І лепшага падарунка нельга было пажадаць, як выкананне Лявонам любімай многімі жыхарамі сталіцы песні «Менск і Мінск». Слухачы яшчэ раз адчулі, як аўтар меладычна яскрава і драматычна падкрэсліў дуалізм існавання нашага горада: пантова-савецкага з выгляду, але старажытнага і беларускага па менталітэту.

Важкі ўнёсак у святочную атмасферу гадавіны кампаніі «Будзьма!» зрабілі музыкі гурта «IQ 48», якія нагадалі свае лепшыя кампазіцыі мінулага і новыя хіты. Іх песня «Гэй, наперад!» на вершы Янкі Купалы якраз прагучала ва ўнісон тым пажаданням, якія выказваліся ў гэты дзень са сцэны.

Своеасаблівы музычны спектакль прапанаваў слухачам спявак і кампазітар Зміцер Вайцюшкевіч, які адразу пасля завяршэння гастрольнай паездкі па ЗША прыехаў у тэатр Беларускай драматургіі павіншаваць сваіх сяброў з кампаніі «Будзьма!». Гэты спектакль складаўся з некалькі частак: філасофскай «Дарогі» (песні на верш У. Някляева), драматычных «Зорак» (на вершы Р. Барадуліна) і лірычна-жартаўлівай песні «Суседка», якую Зміцер стварыў на верш Г. Бураўкіна. На завяршэнне свайго выступу З. Вайцюшкевіч нагадаў знакамітую «Песню галоднага ваўка» з праекта «Цацачная крама», якую слухачы заспявалі разам.

Свае віншаванні для гадавалага дзіцяці — кампаніі «Будзьма!» — выказалі і іншыя беларускія артысты: аўтарка сатырычных апавяданняў Анка Упала, фальклорная капэла «Церніца» і хэдлайнер гэтага святочнага канцэрта — гурт «Крамбамбуля» з каларытным Лявонам Вольскім на лідэр-вакале.

Што ж тычыцца святочнага настрою, то ён, безумоўна, меў пад сабою грунт: за невялікі тэрмін сябрамі кампаніі зроблена на дзіва шмат. Але ў наступныя гады, відавочна, давядзецца ажыццявіць значна больш, каб лозунг кампаніі «Будзьма беларусамі — гэта нас аб'ядноўвае і робіць унікальнымі!» сапраўды набыў рэальныя абрысы. Дзеля гэтага спатрэбіцца творчы імпэт, крэатыўныя ідэі, уменне дамаўляцца і ісці на прымальны кампраміс без размывання (а такія спробы назіраюцца: прыглядзіцеся да раздзела «Музыка» сайта http://budzma.org) асноўнай мэты кампаніі «Будзьма!» — усебаковага спрыяння Беларушчыне.

▸ ФЭСТ

# УКРАІНСКІЯ МАСТАКІ ПЕРАЛЕЗУЦЬ ПРАЗ БЕЛАРУСКУЮ МЯЖУ

**12–13 снежня ў мінскай галерэі сучаснага мастацтва «Ў» будзе праходзіць першы фестываль актуальнага ўкраінскага мастацтва ў Беларусі «Пералаз».**

пералаз
кантрабанда украінскай культуры

Наведнікі змогуць атрымаць асалоду ад незадэклараваных украінскіх вершаў, думак і перажыванняў.

«Пералаз» — гэта своеасаблівы адказ фестывалю «Беларуская вясна», які тры гады запар прадстаўляў беларускую неафіцыйную культуру ва Украіне. Такім чынам арганізатары вырашылі выраўняць баланс культурнага абмену паміж нашымі дзяржавамі, узмацніўшы напрамак Кіеў—Мінск.

У Мінск прыедзе ўкраінскі паэт і перакладчык Сашко Ірванец, каб разам з Уладзімірам Арловым сустрэцца з беларускімі чытачамі. Слэмеры Дмытро Лазуткін, Арцём Паляжака, Паўло Карабчук у складзе ўкраінскай паэтычнай зборнай, дадуць бой магутнай беларускай камандзе; вядучым слэму — слэм-майстрам будзе Андрэй Хадановіч.

Арганізатар фестывалю — творчая ініцыятыва «Беларускі дэсант», супольнасць неабыякавых да свежай і актуальнай беларускай культуры ўкраінскіх грамадзян, гатовых прасоўваць яе ва Украіне. Гэта фармацыя дапамагае цікаваму беларускаму contemporary art знаходзіць свайго спажыўца ва Украіне, а цяпер прадстаўляе ўкраінскае мастацтва ў Беларусі.

«Пералаз» гасцінна прымае ў сваю творчую прастору галерэя сучаснага мастацтва «Ў», якая знаходзіцца па адрасу пр. Незалежнасці, 37а; інфармацыйныя партнёры фестывалю — партал грамадзянскае кампаніі «Будзьма!» і газета «Наша Ніва».

Праграма, афіша і ўся інфармацыя пра фэст — на сайце belarus.org.ua.

Кантакты: Юлія Нузбан, прэс-аташэ +380951680969 yulia.nuzban@gmail.com; http://belarus.org.ua/

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 820
Падпісана да друку 11.12.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.